Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
[illegible]
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

СЕРАДА 17 лютага 1932 г. № 38 (3427)

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:
АРТЫКУЛЫ: Перадавы. ГНІЛЯКЕВІЧ—Саветы да III-яй бальшавіцкай. ГОРЫН—Як і над чым працуе Акадэмія (2 стар.). Загатоўчую работу на вышэйшую ступень («ПРАВДА»)—(3 стар.).
ПАСТАНОВА ЦВК АБ ВЕСНАВОЙ СЯУБЕ (1 стар.).
ПАСТАНОВА СНКБ і ЦК КП(б)Б АБ ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРКАХ (1 стар.).
Трэцяй бальшавіцкай—добраякаснае насеньне (2 стар).
Усесаюзная пераклічка—сацспаборніцтва на транспарце (2 стар.).
За тэхнічна-эканамічную незалежнасьць СССР (3 стар).
Ліквідаваць адставаньне ў рэалізацыі акцый Трактарацэнтру (3 стар.)
91.500.000 пар абутку павінна даць прамысловасьць ў 4 заключным.
ЗА МЯЖОЮ. ПА БССР. (4 стар.).

ПРА СТАНОВІШЧА ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРАК

З пастановы Савету Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б

Выслухаўшы даклад Белкаапсаюзу аб становішчы прыгарадных гаспадарак спажывецкай каапэрацыі БССР і плян разгортваньня прыгарадных гаспадарак на 1932 г., ЦК КП(б)Б і СНК БССР адзначаюць, што:

1. Прыгарадныя гаспадаркі пры значнай дапамозе рабочых мас ўжо занялі значнае месца ў забясьпечаньні рабочага спажыўца гароднінай, малочнай і мясной прадукцыяй.

Здана прыгараднымі гаспадаркамі для забясьпечаньня рабочых 30.000 тон гародніны, 35000 цнт. малака, 120000 цнт. сьвіного мяса і сала; засолена 726 тон гуркоў і памідораў і заквашана 2.300 тон капусты.

2. Побач з гэтым ЦК КП(б)Б і СНК прызнаюць нездавальняючымі вынікі работы прыгарадных гаспадарак у 1931 г. па вытворчых паказьніках, што зьявіліся на прычынах:

а) нізкай ураджайнасьці, б) неарганізаванасьці работы і дрэннай уборкі, в) вялікага проценту асяданьня прадукцыі ў прыгарадных гаспадарках, г) безгаспадарчасьці ў самой вытворчасьці і па будаўніцтве, д) наяўнасьці абязьлічкі, адсутнасьці зьдзельшчыны і гаспадарчага разьліку, е) наяўнасьці рвацкіх тэндэнцый у паасобных гаспадарках, ж) дрэннага догляду за жывёлай, з) высокага сабекошту і неэфэктыўнасьці работы.

3 Нездавальняючыя якасныя паказчыкі прывялі да ўкладаньня ў прыгарадныя гаспадаркі ўласных зваротных сродкаў ЦРК (2.650 тыс. руб.), вялікай запазычанасьці Дзяржбанку па эксплёатацыйных сумах (1.270 т. р.), а таксама нескончэньня раду пачатых пабудоў (кароўнікі, сьвінарнікі, жылыя дамы) і вялікай запазычанасьці па заработнай плаце рабочым і будаўнічым арганізацыям (1.100 тыс. руб.) і поўнай адсутнасьці уласных зваротных капіталаў, што прывяло прыгарадныя гаспадаркі да выключнага цяжкага фінансавага становішча.

Нездавальняючае становішча прыгарадных гаспадарак зьяўляецца вынікам ня толькі дрэннай работы каапэрацыйных арганізацый у гэтай галіне, але і тым, што гарадзкія саветы, прафарганізацыі і мясцовыя партарганізацыі не звярочвалі дастатковай увагі на арганізацыю і ўмацаваньне прыгарадных гаспадарак і дапамогу ў гэтай рабоце каапэрацыйным арганізацыям.

Адзначаючы гэта, ЦК КП(б)Б і СНК БССР для зьнішчэньня паказаных буйнейшых недахопаў у гаспадарчай дзейнасьці прыгарадных гаспадарак, забясьпечаньня выкананьня пляну 1932 г., асабліва якасных паказчыкаў і ўмацаваньня фінансавага становішча на 1932 г. пастанаўляюць:

1. Рашаючай задачай усяе працы прыгарадных гаспадарак павінна быць безумоўна забясьпечаньне ўзьняцьця ўраджайнасьці і таварнасьці, зьніжэньня да мінімуму асяданьня прадукцыі ў гаспадарках, зьнішчэньне безгаспадарчасьці, абязьлічкі і поўны перавод прыгарадных гаспадарак і асобных галін у самых гаспадарках на гаспадарчы разьлік.

2. У зьмену пастановы бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб кантрольных лічбах на 1932 г. па прыгарадных гаспадарках зацьвердзіць плян разьвіцьця гаспадарак у наступных разьмерах:

а) па гародах устанавіць рост з 5.600 га да 6.500 га (рост 16 проц.), забясьпечыўшы ўраджайнасьць з 1 га гародных культур у сярэднім 12 тон з агульным выхадам валавой прадукцыі 71 тыс. тон замест 54 тыс. тон 1931 г. (рост 77 проц.);

б) рост малочнага статку давесьці з 8.000 да 10.000 галоў, забясьпечыўшы выхад таварнай прадукцыі ў 12.420 тон замест 3.900 тон у 1931 г.;

в) сьвінаматачны статак давесьці з 4.000 галоў да 6.000 галоў (рост 34 проц.), забясьпечыўшы паўтара апаросу з выхадам прадукцыі ў 52.276 парасят або ў сярэднім 8,7 парасят на сьвінаматку;

г) на працягу 1932 г. адкарміць 33 тыс. галоў сьвіней з пераходзячым статкам на 1-I-33 г. 15 тыс. галоў. Асноўнай крыніцай забясьпечаньня сьвінаадкормачных пунктаў павінны быць сьвінаматачныя гаспадаркі;

д) давесьці статак трусоў да 3 тыс. штук, забясьпечыўшы выхад маладняка ў 27 тыс. штук, статак птушак давесьці да 3 тыс. штук з выхадам маладняка ў 40 тыс. штук. Забараніць гарадзкім саветам зьмяняць пляны, зацьверджаныя Белкаапсаюзам без узгадненьня з апошнім.

4. Прапанаваць Беладдзяленьню Трактарацэнтру, пад адказнасьць тав. Каршакевіча, у 5-цідзённы тэрмін заключыць дагавор з Белкаапсаюзам на аказаньне дапамогі прыгарадным гаспадаркам трактарным паркам у раёнах дзейнасьці МТС.

5. Зацьвердзіць агульную колькасьць плошчы прыгарадных гаспадарках у 40.000 га (без раённых саюзаў) замест 29.000 га з тым, каб безумоўна была забясьпечана ўласная кармавая база ў 1932 г.: 100 проц. патрэбы грубых кармоў, 100 проц. сакавітых і да 50 проц. канцэнтраваных.

Абавязаць НКЗемляробства ў дэкадны тэрмін устанавіць плян адводу зямель і палкам ажыцьцявіць яго не пазьней 1 мая 1932 году.

7. Для задаваленьня цяжкага фінансавага становішча прыгарадных гаспадарак і забясьпечаньня іх патрэбнымі зваротнымі сродкамі, лічыць патрэбным:

б) уласныя асноўныя сродкі, укладзеныя ЦРК, пакінуць у прыгарадных гаспадарках, як уласныя капіталы. Прапанаваць прэзыдыўму Белкаапсаюзу паставіць пытаньне перад кіраўніцтвам Усекабанку і прэзыдыўмам Цэнтрасаюзу аб выдачы доўгатэрміновай ссуды для пагашэньня ўкладзеных ЦРК уласных сродкаў у капітальнае будаўніцтва з тым, каб за лік гэтых сум забясьпечыць прыгарадныя гаспадаркі зваротнымі сродкамі;

в) абмеркаваць пытаньне аб адшуканьні патрэбных сродкаў унутры рэспублікі, а таксама праз спэцыяльнае хадатайніцтва перад Саюзным Урадам аб аказаньні неабходнай фінансавай дапамогі прыгарадным гаспадаркам для выплаты запазычанасьці Дзяржбанку і пакрыцьця дапушчаных страт.

8. Адзначаючы цяжкае становішча з кармамі ў прыгарадных гаспадарках, асабліва з канцэнтраванымі і прызнаючы недапушчальна нядбайныя адносіны Бел. Канторы Саюзпрамкорму да выкананьня нарадаў на гэты від кармоў для прыгарадных гаспадарак, абавязаць Бел. Кантору Саюзпрамкорм, пад адказнасьць упаўнаважанага т. Івашкевіча, неадкладна выканаць нарады Саюзпрамкорму на канцэнтраваныя кармы для прыгарадных гаспадарак, а прэзыдыўм Белкаапсаюзу ўжыць усе тэрміновыя захады да поўнага забесьпячэньня гаспадарак грубымі кармамі (сена, салома).

Прапанаваць упаўнаважанаму НК Шляхоў, пад адказнасьць т. Эгле, ужыць усе захады да забесьпячэньня перавозак кармоў, якія загатоўлены і знаходзяцца на чыгуначных станцыях.

9. Адзначаючы абсалютна нездавальняючае апэрацыйнае кіраваньне Сельскагаспадарчага Аб'яднаньня Белкаапсаюзу, прапанаваць Аддзелу Кадраў ЦК КП(б)Б, разам з т. Хаскіным у 5-дзённы тэрмін намеціць ня менш 3-х кандыдатур на кіруючую працу ў апарат Сельскагаспадарчага Аб'яднаньня і падаць на зацьверджаньне Сакратарыяту ЦК КП(б)Б.

10. Адзначаючы слабасьць і нездавальняючасьць кіруючых кадраў прыгарадных гаспадарак, а таксама зусім недастатковую колькасьць кваліфікаваных рабочых, абавязаць Гарком КП(б)Б на працягу месяца ўжыць захады да ўмацаваньня гаспадарак кіруючым складам работнікаў, а Белкаапсаюзу праз сваю навучальную сетку і спэцыяльную арганізацыю курсаў забясьпечыць камплектаваньне гаспадарак кваліфікаванымі работнікамі. Пашырыць на прыгарадныя гаспадаркі дырэктывы ЦК аб саўгасах НК Земляробства ў частцы недапушчэньня зьняцьця дырэктароў прыгарадных гаспадарак без узгадненьня з Прэзыдыўмам Белкаапсаюзу.

11. Для прывядзеньня ў парадак рахункаводзтва і справаздачнасьці ў прыгарадных гаспадарках, прапанаваць НК Працы, ЦСПСБ і Белкаапсаюзу мабілізаваць ня менш 20 рахунковых работнікаў для гэтай працы ў гаспадарках тэрмінам на 1 месяц.

12. Ухваліць пастанову Прэзыдыўму ЦСПСБ і Белкаапсаюзу аб перадачы раду прыгарадных гаспадарак, якія ня маюць агульна-гарадзкога значэньня, асобным ЗРК і ЗВК, для максымальнага набліжэньня гаспадарак да фабрык і заводаў, а таксама згадзіцца з пастановай Прэзыдыўму Белкаапсаюзу і ЦСПСБ аб разбуйненьні з мэтаю лепшага спэцыялізаванага кіраваньня прыгараднымі гаспадаркамі Сельскагаспадарчага Аб'яднаньня Белкаапсаюзу на два самастойных аб'яднаньня—гародна-малочнае і сьвінагадоўчае.

Пляннаваньне і агульнае кіраваньне гаспадаркамі якія перадаюцца ЗРК і ЗВК, павінна забясьпечвацца сельгасаб'яднаньнямі Белкаапсаюзу.

Запрапанаваць Прэзыдыўму Белкаапсаюзу рашуча ўзмоцніць кіраваньне сельгасаб'яднаньнямі.

13. Абавязаць Прэзыдыўм Белкаапсаюзу, ЦСПСБ, мясцовыя партыйныя і прафарганізацыі і гарсаветы неадкладна пачаць правядзеньне важнейшых мерапрыемстваў, зьвязаных з падрыхтоўкай да веснавой сяўбы ў прыгарадных гаспадарках (вывазка ўгнаеньня, загатоўка насеньня, падрыхтоўка парнікоў, вярбоўка рабочай сілы), паставіўшы ў цэнтры ўвагі ўсяе работы прыгарадных гаспадарак рашучае палепшаньне якасных паказчыкаў і адхіленьне раду буйнейшых недахопаў, якія былі ў пэрыяд падрыхтоўкі да веснавой кампаніі мінулага году.

14. Улічваючы выключнае значэньне ў справе рабочага снабжэньня, выкананьне пляну намечанага па прыгарадных гаспадарках і поўнае забесьпячэньне якасных паказчыкаў, прапанаваць сакратарам гаркомаў і старшыням гарпрафсаветаў, раённых праф саветаў, раённых выканаўчых камітэтаў і гарадзкіх саветаў узяць пад нясалабны нагляд і кіраваньне ўсю падрыхтоўчую работу да веснавой пасеўнай кампаніі з тым, каб усякія тормазы і перабоі былі-б зьнішчаны.

15. Адзначаючы абсалютна нездавальняючае становішча масавай палітычнай работы ў прыгарадных гаспадарках і слабое парткіраўніцтва парт' ячэек гэтых гаспадарак, прапанаваць гаркомам і райкомам узмацніць парт' ячэйкі гаспадарак з тым, каб кіраўніцтва іх было ў значнай меры ўзмоцнена, а таксама разгарнуць масавую і палітычную работу пад пунктам погляду мабілізацыі рабочых мас на адхіленьне маючыхся недахопаў у працы і поўнае выкананьне пляну пасеўкампаніі і ўсіх якасных паказчыкаў, максімальна разгортваючы і ўкараняючы сацыялістычныя формы працы сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

16. На падставе гэтай пастановы, прапанаваць партыйным і прафсаюзным арганізацыям пры самым шырокім удзеле рабочых мас, правесьці выслухоўваньне даклада ўсіх дырэктароў прыгарадных гаспадарак аб выніках працы за 1931 г., вытворчагаспадарчым пляне на 1932 год і аб падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі.

17. Надаючы вялікае значэньне прыгарадным гаспадаркам, і прызнаючы што хутчэйшае арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне іх магчыма толькі пры самым актыўным удзеле і кантролі шырокіх рабочых мас, лічыць патрэбным арганізаваць пры рэдакцыі газэты «Рабочий» усебеларускі штаб кантролю за работай прыгарадных гаспадарак у складзе: прадстаўніка рэдакцыі газэты «Рабочий», НК-РСІ, НКЗемляробства, ЦСПСБ і Белкаапсаюзу.

Такія-ж штабы арганізаваць пры рэдакцыі газэт прамысловых гарадоў і прамысловых рабочых цэнтраў.

Старшыня СНК БССР **М. Галадзед.**

Сакратар ЦК КП(б)Б **Шаранговіч.**

9 лютага 1932 г.

ЗА МЯЖОЮ

Японскія імпэрыялісты рыхтуюцца да буйных апэрацый

У Шанхай прыбылі новыя падмацаваньні японцаў

ТОКІЕ, 15-II. Камандуючы японскім дэсантам віцэ-адмірал Усмацу, у сувязі з прыбыцьцём у Шанхай сухапутнага войска сёньня заявіў, што хутка пачнуцца буйныя апэрацыі японскага войска ў раёне Чапэю.

ШАНХАЙ. 15-II. Японцы пачалі ўмацоўваць лінію фронта, якая фактычна пашыраецца ад Чапэю да Усуна. Японскае войска займае пазіцыю ўздоўж дарогі ў Усун. Японскае войска перасекла Усунскую бухту, але затым пасьля жорсткай бойкі вымушана было зьвярнуцца на старыя пазіцыі. У Чапэі зацішша. Як відаць абодвы бакі рыхтуюцца да рашучых дзеяньняў.

Японскі флёт бамбардыруе Усун

ТОКІЕ. 15-II. У паведамленьні морскага міністэрства заяўляецца, што японскія судны моцна бамбардыравалі Усун, з мэтай «прыкрыць высадку войска, прыбыўшага на 7 транспартах у Шанхай».

Далей у паведамленьні зазначаецца, што кітайскія часьці, не аказаўшы, нібы, ніякага супраціўленьня ў 8 гадзін раніцы пачалі адступленьне з Усуна на грузавіках, у напрамку Янцзятуна.

ШАНХАЙ. 15-II. Кітайскі друк паведамляе, што знаходзячыся ў Усуне —унівэрсытэт Тунцзы, марскі каледж, школа па рыбалоўству, нацыянальны ўнівэрсытэт, мэдычны каледж, сельска-гаспадарчая школа—разбураны ў рэзультаце японскай бамбардыроўкі.

Газэты паведамляюць, што вялікая колькасьць студэнтаў (каля 4-х тыс.), якія вучыліся ў гэтых вучэбных установах, прыбыла ў Шанхай. Астатнія загінулі бяз весткі.

Паражэньне японцаў у ваколіцах Шанхаю

БЭРЛІН. 15-II. Шанхайскі карэспандэнт канцэрна Ульштэйн паведамляе: кітайская камэндатура ў Шанхаі пацьвярджае, што атрад у 1 тысячу японскіх салдат, перайшоўшых рэчку Вуанпу быў разгромлены 2-ма кітайскімі палкамі.

Кітайцы ўмацоўваюць Чапэй і Нанкін

ТОКІЕ. 15-II. У камуніке (паведамленьні) морскага міністэрства паведамляецца, што кітайскія часьці прадоўжваюць узводзіць умацаваньні ў Чапэі.

У той-жа час прадстаўнікі японскага флёту ў Нанкіне вядуць перагаворы з кітайскай уладай і патрабуюць устрымыньня прыбыцьця войска Чжан-Фа-Гуя ў Нанкін.

Чан-Кай-Шы ўчора на самалёце прыбыў у Нанкін.

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ тав. ЛІТВІНАВА—буйнейшая падзея на канфэрэнцыі па „разбраеньні“

Нявольнае прызнаньне баўгарскай буржуазіі

ВЕНА. 15-II. Паводле паведамленьня з Сафіі, большасьць баўгарскіх газэт зьмясьціла поўнасьцю прамову тав. Літвінава на Жэнэўскай канфэрэнцыі па разбраеньні. Выступленьне тав. Літвінава падаецца газэтамі ў выглядзе сэнсацыі і друкуецца на першай паласе. Сафійскія буржуазныя газэты «Утро» і «Заря» у сваіх каментарыях называюць выступленьне тав. Літвінава буйнейшай падзеяй канфэрэнцыі.

Турэцкі міністр замежных спраў аб канфэрэнцыі па „разбраеньні“ і прамове т. Літвінава

ЖЭНЭВА. 15-II. Сёньня на канфэрэнцыі першым выступіў турэцкі міністр замежных спраў Тэффік-Рышцю-Бэй, які, закранаючы становішча Турцыі падкрэсьліў, што паміж Турцыяй і іншымі краінамі ў сучасны момант не існуе якіх-небудзь сур'ёзных супярэчнасьцяў. Закранаючы турэцкія ўзбраеньні, Тэффік-Рюшцю-Бэй заяўляе, што Турцыя ў апошні год скасавала 6 пяхотных дывізій і 3 кавалерыйскіх дывізіі і скараціла за апошняе пяцігодзьдзе ваенны бюджэт на 30 мільёнаў турэцкіх лір, г. зн. на адну трэць. «З другога боку, усім вядомы, гаворыць Тэффік-Рюшцю-Бэй, пратаколы аб морскіх узбраеньнях, заключаныя з намі Грэцыяй і СССР».

Закранаючы францускія прапановы Тэфік-Рюшцю-Бэй заяўляе, што Турцыя гатова іх прыняць, калі яны некіраваны да поўнага скасаваньня нацыянальных узбраеньняў і да поўнага разбраеньня». Аднак, калі ў аўтараў праекту маецца іншая канцэпцыя,—застэрэцца,— гаворыць ён, толькі далучыцца да вельмі правільнай крытыкі, фармуляванай Літвінавым».

„Выступаючы ад імя Вашага ўраду, Вы гаворыце ад імя мільёнаў працоўных усяго сьвету“

ЖЭНЭВА. 15-II. Тав. Літвінаў атрымлівае ў адказ на сваё выступленьне на канфэрэнцыі «па разбраеньні» шматлікія прывітальныя тэлеграмы і лісты ад рабочых арганізацый і розных асоб.

Чэхаславацкія работніцы ў сваім прывітаньні пішуць: «працоўныя жанчыны Чэхаславакіі з напружаньнем сочаць за Вашымі пасьлядоўнымі выступленьнямі ў абарону міру і разбраеньня і супроць тых, якія адкрыта альбо тайна падрыхтоўваюць жахі новых войнаў. Выступаючы ад імя Вашага ўраду, Вы гаворыце, аднача сова ад імя мільёнаў матак і сёстраў працоўных усяго сьвету.» Працоўныя жанчыны ўсіх нацый адабраюць Вашу барацьбу за мір і разбраеньне».

Ліст гэты быў напісаны па даручэньні сходу работніц гораду Кляндо.

ПАЗШ і Англія „пратэстуюць“

ВАШЫНГТОН. 15-II. Дзяржаўны дэпартамант паведаміў, што амэрыканскі консул у Шанхаі заявіў пратэст супроць высадкі вялікай колькасьці японскага войска ў Хонкю. Англійскі консул заявіў такі-ж самы пратэст.

М. Гніляке́віч

САВЕТЫ ДА ТРЭЦЯЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ

Кантрольнымі лічбамі на 1932 завяршаючы год пяцігодкі вызначаны вялізарныя пляны па ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя пляны пры наяўнасьці творчай актыўнасьці і энтузіязму ўсіх працоўных даюць магчымасьць скончыць пяцігодку ў чатыры гады. Посьпехі ў сацыялістычнай рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі БССР, якія дасягнуты да гэтага часу, ствараюць усе неабходныя ўмовы да выкананьня задач апошняга году пяцігодкі.

Кантрольнымі лічбамі вызначаны вялікія мерапрыемствы ў галіне далейшага разьвіцьця вытворчых сіл сельскай гаспадаркі, якая рэканструюецца на сацыялістычных падставах. Магутнае разьвіцьцё сацыялістычнай прамысловасьці забясьпечвае ўмацненьне тэхнічнай узброенасьці сельскай гаспадаркі і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, што ў сваю чаргу дае магчымасьць у 1932-33 г. г. скончыць у асноўным суцэльную калектывізацыю і канчаткова ліквідаваць на гэтай падставе кулацтва, як клясу.

Маючы гэта на ўвазе трэба адзначыць, што падрыхтоўка і правядзеньне 3-цяй бальшавіцкай веснавой пасяўной кампаніі павінна забясьпечыць выкананьне важнейшых задач апошняга году пяцігодкі ў сельскай гаспадарцы. На 1932 год прадугледжваецца значнае падвышэньне ўраджайнасьці, пашырэньне пасяўной плошчы, падвышэньне якасьці сельска-гаспадарчай прадукцыі, больш шырокае ўкараненьне агра-тэхнікі ў сельскую гаспадарку і разгортваньне барацьбы са стратамі ў сельскай гаспадарцы.

Пасьпяховае правядзеньне падрыхтоўкі да веснавой сяўбы і яе правядзеньне абавязвае саветы і райвыканкомы ўлічыць усе недахопы мінулых год, галоўнымі з якіх зьяўляліся: зацяжка ў давядзеньні плянаў да саўгасаў, калгасаў, несваячасовая падрыхтоўка тэхнічных сродкаў для правядзеньня гэтай кампаніі, дрэнная якасьць рамонту, асабліва трактароў значная зацяжка тэрмінаў сяўбы, нездавальняючая арганізацыя працы ў калгасах, недастатковае ўкараненьне гаспадарчага разьліку ў саўгасах, МТС і г. д.

Для дасягненьня посьпехаў у правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі і ліквідацыі адзначаных недахопаў мінулых гадоў, саветы павінны зараз-жа разгарнуць шырокую арганізацыйна-масавую работу сярод рабочых, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Адным з галоўных момантаў у падрыхтоўцы зьяўляецца сваячасовая і дакладная распрацоўка плянаў пасяўной кампаніі і сваячасовае спусканьне гэтых плянаў уніз. Неабходна, каб пляны пасяўной кампаніі былі шырока абгавораны калгасьнікамі, прапрацаваны ў брыгадах, вывераны, выпраўлены сустрэчнымі праплянамі, сустрэчнымі плянамі. Да шырокай прапрацоўкі і папулярызацыі плянаў пасяўной кампаніі неабходна прыцягнуць сэкцыі, дэпутацкія групы і іншыя масавыя арганізацыі саветаў. Пляны пасяўной кампаніі павінны быць канкрэтнымі і распрацаваны ня толькі па паасобных вучастках работы, але і па дакладных тэрмінах іх выкананьня.

Весткі, якія паступаюць зараз з месц гавораць аб тым, што падрыхтоўка да веснавой сяўбы праводзіцца яшчэ вельмі слаба і што некаторыя саветы стаяць у баку ад гэтай справы. Трэба памятаць, што саветы і раённыя выканаўчыя камітэты за правільную і сваячасовую падрыхтоўку да веснавой кампаніі нясуць ня меншую адказнасьць, як паасобныя калгасы, саўгасы і МТС. Канкрэтная пляны падрыхтоўкі да веснавой сяўбы павінны прадугледзіць максымальнае скарачэньне часу сяўбы, шырока скарыстоўваючы вопыт лепшых саўгасаў, калгасаў і МТС.

Цэнтральнай баявой задачай у рабоце саветаў пры падрыхтоўцы да сяўбы, павінна стаць арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Саветы павінны зьвярнуць выключную ўвагу на правільную арганізацыю працы ў саўгасах, калгасах і МТС на лепшую арганізацыю брыгад, як важнейшай формы правільнай арганізацыі працы. Асаблівую ўвагу павінны зьвярнуць саветы на падвышэньне прадукцыйнасьці працы, а таксама на ўздым працдысцыпліны, поўнае ўвядзеньне зьдзельшчыны па ўсіх відах работ і на падставе гэтага ліквідацыі абязьлічкі і ўраўнілаўкі. Адначасова з гэтым не павінна паслабляцца ўвага да падрыхтоўкі правядзеньня сяўбы ў аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках, каб у выніку гэтага саветамі былі створаны неабходныя ўмовы для ўцягненьня гэтых гаспадарак у калгас.

У справе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы асаблівую ролю могуць і павінны адыграць гарадзкія саветы. Гарсаветы павінны арганізаваць рамонтныя брыгады, пасылку працаўнікоў на вёску, праверку выкананьня прамысловых заказаў для патрэб веснавой пасеўнай кампаніі, праверку падрыхтаванасьці транспарту да вясновых перавозак, а таксама арганізаваць пасылку працоўных для практычнай дапамогі ў прыгарадных гаспадарках.

Уся падрыхтоўчая работа і правядзеньне веснавой сяўбы павінны быць шырока прасякнуты мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва і скарыстаньня іншых форм актыўнасьці працоўных мас. Саветы павінны арганізаваць абмен лепшым вопытам і сацыялістычнымі мэтадамі працы паміж паасобнымі саўгасамі, МТС і калгасамі, а таксама паасобнымі саветамі і раёнамі, заключаючы паміж сабою сацыялістычныя дагаворы па лепшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі, паклаўшы ў аснову выкананьне 6-ці гістарычных умоў т. Сталіна.

З боку саветаў і райвыканкомаў павінна быць забясьпечана канкрэтнае кіраўніцтва і кантроль за выкананьнем плянаў падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы ў рабоце ўсіх савецкіх, гаспадарчых і калгасна-каапэрацыйных органаў. Саветы і райвыканкомы павінны сыстэматычна правяраць ход падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы, як праз спэцыяльныя брыгады, сэкцыі, дэпутацкія групы і інш. масавыя арганізацыі саветаў, так і праз сыстэматычнае заслухоўваньне дакладаў паасобных саўгасаў, МТС і калгасаў на сваіх пасяджэньнях.

Саветам і райвыканкомам неабходна памятаць, што іх работа па падрыхтоўцы і правядзеньні веснавай пасеўнай кампаніі будзе ацэньвацца па падвышэньні ўраджайнасьці ў кожным саўгасе і калгасе, а таксама на выніках пасяўной кампаніі. Саветы і райвыканкомы павінны зараз-жа пераключыцца на пасьпяховае ажыцьцяўленьне гэтай важнейшай кампаніі, якая забясьпечвае посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва і на іншых вучастках работы.

У падрыхтоўцы да веснавой сяўбы трэба памятаць аб клясавай барацьбе, аб тым, што клясавы вораг—кулак яшчэ канчаткова не дабіт, і што ён будзе ў розных формах праяўляць сваю шкодную дзейнасьць і імкнуцца да таго, каб сарваць веснавую сяўбу і тым самым пашкодзіць сацыялістычнаму будаўніцтву. Трэба павесьці самую рашучую барацьбу супроць клясавага ворага, а таксама даваць рашучы адпор апартуністычнай недаацэнцы пасяўной кампаніі 1932 году—гэтай важнейшай кампаніі ў апошнім завяршаючым годзе пяцігодкі.

Толькі пры поўным скарыстаньні шырокай актыўнасьці і энтузіязму шырокіх працоўных мас, толькі пры шырокім разгортваньні арганізацыйна-масавай работы, саветы здолеюць выканаць тыя задачы, якія ўскладае на іх партыя і ўрад у справе падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы.

Улічыўшы гэта саветы павінны заразжа шырока разгарнуць барацьбу за стопроцантнае выкананьне ўсіх заданьняў у галіне веснавой пасяўной кампаніі.

Аб падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўнай кампаніі 1932 году

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

Беларуская ССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, дасягнула значных посьпехаў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. У калгасах БССР аб'яднана звыш 50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Сацыялістычны сэктар стаў асноўным вытворцай важнейшых відаў сельскагаспадарчай сыравіны і прадукцыі. Калгасьнікіператварыліся ў цэнтральную фігуру земляробства.

Магутнае разьвіцьцё сацыялістычнай прамысловасьці забясьпечвае вялізарнае ўзмацненьне тэхнічнай узброенасьці сельскай гаспадаркі. Вядучы змаганьне за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў, як цэнтральнай задачы калгаснага руху, Беларуская ССР вызначае вялізарныя эрухі ў падвышэньні ўраджайнасьці і росту таварнай прадукцыі сельскай гаспадаркі.

Надыходзячая вясеньняя пасеўная кампанія мае вялізарнейшае значэньне ў справе далейшай работы па сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі. Барацьба за бальшавіцкае правядзеньне вяснавой сяўбы, барацьба за ўзьняцьцё ўраджайнасьці—зьяўляюцца важнейшай задачай барацьбы за пасьпяховае выкананьне пяцігодкі ў 4 гады, за другую пяцігодку.

Задачай саветаў, райвыканкомаў, гаспадарча-каапэрацыйных арганізацый і ўсяе грамадзкасьці БССР у 1932 завяршаючым годзе пяцігодкі зьяўляецца барацьба за высокую ўраджайнасьць, прадукцыйнасьць стада на аснове рэалізацыі 6-ці гістарычных умоў тав. Сталіна, за ўладаньне агратэхнікай ў сельска-гаспадарчай вытворчасьці ўжо ў пэрыяд падрыхтоўчай кампаніі з тым, каб вясновая сяўба 1932 году забясьпечыла канчатковую ліквідацыю нізкіх ураджаяў. Між тым, папярэднія даныя аб падрыхтоўцы да вяснавой сяўбы, як-та: аб мабілізацыі насенных фондаў, ачыстцы іх, абмену на лепшыя гатункі, рамонце трактароў і сельскагаспадарчых машын, вывазцы гною, штучным угнаеньні, зборы попелу і інш. мерапрыемствах, забясьпечваючых падвышэньне ўраджайнасьці паказваюць, што падрыхтоўка да сяўбы яшчэ не стала ў цэнтры ўвагі штодзённай работы савецкіх і гаспадарчых арганізацый.

Выходзячы з гэтага і ў мэтах сваячасовай і поўнай падрыхтоўкі да веснавой пасяўной кампаніі,—Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе

1. Для забясьпечаньня засеву вызначанай па плянах плошчы яравога кліну ўвесну 1932 г. абавязаць райвыканкомы і саветы, наркаматы і цэнтральныя ўстановы ў самы кароткі тэрмін мабілізаваць усю грамадзкасьць і мясцовы актыў на сканчэньне складаньня плянаў вяснавой пасеўнай кампаніі (не пазьней 20 лютага), асабліва па калгасах і саўгасах, разгарнуўшы шырокае абгавараньне плянаў падрыхтоўкі і сяўбы на сэкцыях саветаў, дэпутацкіх групах, вытворчых нарадах і агульных сходах рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Асноўнай задачай саветаў у падрыхтоўцы і правядзеньні вяснавой сяўбы павінна быць арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў. Асабліва павінна быць завострана ўвага на правільнай арганізацыі працы ў саўгасах, МТС і калгасах, падняцьці працдысцыпліны і вытворчасьці працы, поўным увядзеньні ва ўсе віды працы зьдзельшчыны, ліквідацыі абязьлічкі і ўраўнілаўкі. Асноўнай вытворчай адзінкай ва ўсіх работах павінна зьявіцца брыгада.

2. Пасьпяховасьць правядзеньня падрыхтоўчай работы і вынікі сяўбы будуць выключна залежаць ад мабілізацыі насенных рэсурсаў, рамонту машын і сельска-гаспадарчага інвэнтару, захаваньня і падрыхтоўкі да вясны цяглавай сілы, чаму абавязаць усе саветы і гаспадарчыя арганізацыі безадкладна скончыць засыпку насенных фондаў і стварэньне страхавых фондаў, а таксама не пазьней 1-га сакавіка скончыць рамонт машын і сельска-гаспадарчага інвэнтара.

Неадкладна скончыць стварэньне ва ўсіх саўгасах і калгасах страхавых фуражных фондаў для вяснавых работ, забараніўшы выдаткаваньне іх на па простым прызначэньні.

3. Лічачы асноўнай і важнейшай задачай усіх саветаў, райвыканкомаў, саўгасаў, МТС і калгасаў падняцьце ўраджайнасьці абавязаць усе саўгасы, МТС, калгасы, саветы і райвыканкомы правесьці абавязковую і поўную ачыстку насеньня, пераборку бульбы, абмен на сартавое насеньне, згодна ўстаноўленых плянаў, абавязковае і поўнае скарыстаньне ўсіх угнаеньняў і мінэральнага ўгнаеньня пад вясновы пасеў, разгарнуўшы шырокую кампанію па поўным зборы попелу ў саўгасах, калгасах, вёсках і асабліва гарадах і прадпрыемствах, дзе яго ёсьць вялікая колькасьць.

Абавязаць саветы, райвыканкомы, Калгасцэнтр і Наркамзем разгарнуць шырокую кампанію па скарыстаньні торфу як угнаеньня.

Даручыць Наркамзему, Калгасцэнтру і РВК ажыцьцявіць з вясны пераход усіх калгасаў і саўгасаў на правільны севазварот.

4. Абавязаць райвыканкомы, саветы і Наркамзем забясьпечыць сваячасовае правядзеньне землядводаў з такім разьлікам, каб да пачатку вясновых палявых работ былі скончаны земляпаказаньні.

5. Побач з узмацненьнем работы па падрыхтоўцы да сяўбы ў саўгасах, МТС і калгасах, зьвярнуць увагу ўсіх райвыканкомаў і саветаў на малочную месца недаацэнку ў сельска-гаспадарчай вытворчасьці аднаасобнага сэктару, удзельная вага якога застаецца яшчэ і ў гэтую вясновую пасеўную кампанію значнай, і разгарнуць масавую работу сярод бядняцка-серадняцкіх мас сялянства—некалгасьнікаў.

6. Правядзеньне падрыхтоўкі да вяснавой сяўбы, правільная арганізацыя працы ў саўгасах, МТС і калгасах, ауладаньне агратэхнікай патрабуюць значнай колькасьці кадраў і правільнай іх расстаноўкі. Важнейшай задачай усіх райвыканкомаў, саветаў і гаспадарчых арганізацый зьяўляецца арганізацыя ў бліжэйшую дэкаду сеткі курсаў масавай кваліфікацыі рабочых саўгасаў, калгасьнікаў, вылучэньне і падрыхтоўка брыгадзіраў у калгасах і забясьпечаньне іх адпаведнымі ўмовамі работы з тым, каб асноўная маса кароткатэрміновых курсаў была праведзена да вяснавой сяўбы. Побач з гэтым, разгарнуць пры клюбах, хатах-чытальнях, школах, чырвоных кутках і г. д. гурткі па вывучэньні агратэхнікі.

7. Усю падрыхтоўчую работу і правядзеньне вяснавой сяўбы шырока прасякнуць мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва, арганізацыяй сустрэчных плянаў, грамадзкага буксіру і скарыстаньнем іншых форм актыўнасьці працоўных мас, арганізаваць абмен вопытам і сацыялістычнымі мэтадамі працы і заключэньне сацдагавароў паміж саўгасамі, МТС, калгасамі, паасобнымі сельсаветамі і раёнамі.

8. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты і саветы зьвярнуць выключную ўвагу на якасьць, апэрацыйнасьць і канкрэтнае кіраўніцтва і кантроль за выкананьнем плянаў падрыхтоўкі і правядзеньня вяснавой сяўбы ў рабоце савецкіх, гаспадарчых і калгасна-каапэрацыйных органаў.

Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты і саветы сыстэматычна правяраць ход падрыхтоўкі і правядзеньне вяснавой сяўбы праз спэцыяльныя брыгады і масавыя арганізацыі саветаў. Гарадзкім саветам даручаецца арганізаваць дапамогу ў падрыхтоўцы і правядзеньні пасяўной кампаніі праз пасылку брыгад на вёску, адначасова мабілізаваўшы ўвагу масавых арганізацый гарсаветаў—сэкцый і дэпутацкіх груп на дапамогу і праверку выкананьня прамысловасьцю заказаў для патрэб вяснавой пасеўнай кампаніі і на падрыхтаванасьць транспарту да вясновых перавозак. Арганізаваць у працягу лютага месяца шырокую праверку падрыхтаванасьці саўгасаў, МТС, калгасаў і кожнай вытворчай брыгады да выкананьня пляну вяснавой сяўбы. Пры праверцы асаблівую ўвагу зьвярнуць на выкананьне гэтай пастановы на паасобных вучастках работы.

Ускласьці персанальную адказнасьць за сваячасовую і дакладную падрыхтоўку і правядзеньне вяснавой сяўбы на старшынь райвыканкомаў і саветаў.

9. Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР падкрэсьлівае, што ўся работа райвыканкомаў і саветаў па правядзеньні вяснавой сяўбы будзе ацэньвацца ў залежнасьці ад лепшай падрыхтоўкі, сваячасова правядзеньня і якасных вынікаў пасеўнай кампаніі, асабліва па выніках барацьбы за падвышэньне ўраджайнасьці ў кожным саўгасе і калгасе, як важнейшай задачы вяснавой сяўбы.

10. Прэзыдыум ЦВК БССР заклікае ўсіх рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і ўсю савецкую грамадзкасьць вёскі да прыняцьця ўсіх мер для сваячасовай падрыхтоўкі і пасьпяховага правядзеньня бальшавіцкай сяўбы.

Пасьпяховае правядзеньне вяснавой пасеўнай кампаніі 1932 году можа быць забясьпечана толькі пры мабілізацыі ўвагі да гэтай кампаніі ўсёй савецкай грамадзкасьці, усіх арганізацый і ўстаноў на аснове самай рашучай барацьбы супроць клясавых ворагаў, даючы руйнуючы адпор апартуністычнай недаацэнцы гэтай важнейшай кампаніі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гніляке́віч.**

15-га лютага 1932 г.

г. Менск.

Трэцяй бальшавіцкай—добраякаснае насеньне

Поўнасьцю выканаць плян па стварэньні насенных фондаў

Забесьпячэньне пасеўных плошчаў неабходным насенным матэр'ялам зьяўляецца адной з адказьнейшых задач у справе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Між тым, зводка НКЗ БССР на 10 лютага сьведчыць аб тым, што далёка ня ўсюды як сьлед усьвядомілі задачы стварэньня насенных фондаў.

Ня гледзячы на тое, што пастановай ЦК і СНК апошні тэрмін для стварэньня насенных фондаў быў вызначан да 1-га лютага, у радзе месц праяўляецца злачынная бязьдзейнасьць да выкананьня гэтага адказьнейшага мерапрыемства. Плян па насенных фондах выканан толькі на 29,1 проц., па страхавых фондах—20,3 проц.

Рад раёнаў толькі пачынаюць ссыпаць насеньня фонды. Асьвейскі раён выканаў плян толькі на 4 проц., Гарадоцкі—1,1 проц., Вузьдзенскі 3,7 проц., Жлобінскі—0,4 проц., Чэрвеньскі—0,6 проц.

Недапушчальна дрэнна праходзіць загатоўка насеньня траў і караняплодаў. Плян па загатоўках насеньня кармовых культур выканан на 15,4 проц. (па насеньні канюшыны—2,8 проц.), па насеньні караняплодаў — 20,7 проц. і гародніх культур—14,3 проц.

Бальшавіцкі прыклад барацьбы ў справе падрыхтоўкі да сяўбы дае калгас імя Блюхера, Бабруйскага раёну.

Асабліва праяўляюць бязьдзейнасьць Бешанковіцкі, Жыткавіцкі, Нараўлянскі, Плешчаніцкі, Прапойскі, Асьвейскі і Вушацкі раёны, у якіх зусім не разгорнута загатоўка насеньня.

РВК, райкалгассаюзы і загатоўчыя арганізацыі не звароччваюць належнай увагі на стварэньне і загатоўку насенных фондаў. У некаторых мясцох назіраюцца злачынныя адносіны да падрыхтоўкі насеньня да сяўбы.

У тых раёнах, дзе вакол падрыхтоўкі да сяўбы мабілізавана грамадзкасьць, там мы маем поўны пералом у справе стварэньня насенных фондаў. Так, Мсьціслаўскі раён выканаў плян па стварэньні насенных фондаў на 86,9 проц., Чырвона-Слабодскі—81,5 проц., Чырвонапольскі—72,1 проц., Віцебскі—76,9 проц.

У калгасе поўнасьцю створаны на-

Пратручваньне насеньня.

Бальшавіцкі прыклад барацьбы ў справе падрыхтоўкі да сяўбы дае калгас імя Блюхера. У калгасе поўнасьцю створаны насенныя фонды зярнёвых культур і бульбы. Насеньне поўнасьцю ачышчана.

Трэба рашуча пакончыць з недаацэнкай стварэньня насенных фондаў і загатовак насеньня. Раённыя арганізацыі і загатоўчы апарат павінны мабілізаваць усе сілы вакол выкананьня пляну стварэньня насенных і страхавых фондаў і загатовак насеньня.

Вузьдзеншчына не ўзяла бальшавіцкіх тэмпаў

ВУЗДА. Брыгадай работнікаў рай РСІ, упаўнаважаных РВК, калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і селькораў была праведзена праверка падрыхтаванасьці да сяўбы раённых устаноў і цэлага раду сельсаветаў, калгасаў, саўгасаў раёну.

Брыгада выявіла, што райза і райкалгассаюз ня кіруюць як сьлед падрыхтоўкай да сяўбы. Стварэньне насенных фондаў па калгасах праходзіць самацёкам. Замест 1.110 цнт. насеньня тэхкультур ссыпана толькі 1.020 цнт., насеньня шматгадовых траў замест 350 цнт. ёсьць толькі 150 цнт. і г. д.

На падрыхтоўку да сяўбы аднаасобнага сэктару з боку раённых устаноў і сельсаветаў ня зьвернута належнай увагі.

У калгасе «Новы быт», Цеслякоўскага сельсавету, брыгада выявіла цэлы рад прарываў у справе падрыхтоўкі да сяўбы. У калгасе ня скончаны абмалот часткі аўса, рамонт с.-г. машын праводзіцца марудна.

Ня лепш абстаіць справа і ў калгасе «Чырвоная зьвязда», Слабада-Пырашаўскага сельсавету. Рамонт с.г. машын ня скончаны, штучнае ўгнаеньне не завезена, ачыстка насеньня не праводзіцца. Нехапае часткі насеньня лёну і сэрадэлы, але праўленьне калгасу ня прымае захадаў да загатоўкі яго ў межах раёну.

Калгас «Інтэрнацыянал», Вузьдзенскага нацсельсавету, праявіў поўную бязьдзейнасьць у падрыхтоўцы да сяўбы. Да гэтага часу калгас ня скончыў малацьбы аўса, гароху і канюшыны. Насенныя фонды ня створаны, ачыстка насеньня не праводзіцца.

На фоне поўнай бязьдзейнасьці ў справе падрыхтоўкі да трэцяй бальшавіцкай рэзка вызначаецца сваёй арганізаванай работай саўгас Кухцічы. Пасеўныя пляны ў саўгасе прапрацаваны, насеньне ачышчана цалкам, плян па рамонце машын выкананы на 75 проц., цягавай сілай саўгас забясьпечаны.

Трэба рашуча пакончыць з бязьдзейнасьцю сельсаветаў і калгасаў раёну ў падрыхтоўцы да сяўбы. Вузьдзенскія раённыя арганізацыі павінны зьвярнуць пільную ўвагу на падрыхтоўку аднаасобнага сэктару.

Удзельнікі рэйду: **Радзько, Колка, Жаўковіч, Палойка, Снытка, Зыбнёў, Пукала, Асіпоўскі, Махнач.**

Пастанова ЦК КП(б)Б аб засыпцы і загатоўцы насеньня

11 лютага 1932 г.

Заслухаўшы паведамленьне т. Рачыцкага аб ходзе засыпкі насенных фондаў, стварэньні ў калгасах страхавых фондаў і выкананьні плянаў загатовак насеньня траў, караняплодаў і гародных культур, ЦК адзначае, што выкананьне гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай задачы праходзіць зусім нездавальняюча і ставіць пад прамую пагрозу выкананьне плянаў сяўбы.

Засыпка насеньня збожжавых і тэхнічных культур складае 23,2 проц., страхавых 11,9 проц., загатоўка насеньня траў 14 проц., караньплодаў 19 проц., гародніных культур 14 проц. да ўстаноўленага пляну.

ЦК канстатуе, што такое становішча стварылася ў выніку недааценкі, як з боку раду цэнтральных савецкіх і гаспадарчых, так і раённых партыйных, савецкіх і асабліва зямельна-калгасных арганізацый—справы мабілізацыі насенных фондаў, абсалютнай непаваротлівасьці, казёншчыны і прамой бязьдзейнасьці загатоўчых арганізацый (Насенсаюз, Ільнасаюз, Садсаюз і Хлебжывсаюз).

Выходзячы, з вышэйадзначанага, і ў мэтах забесьпячэньня насеньнем вызначаных плянам пасеўных плошчаў ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Абавязаць райкомы, гаркомы, гарсаветы, райвыканкомы, зямельныя і калгасна-каапэрацыйныя арганізацыі ў бліжэйшыя дні дабіцца рашучага пералому ў рабоце з тым, каб не пазьней 10-га сакавіка засыпка насенных і страхавых фондаў была скончана поўнасьцю, у разьмерах вызначаных плянам. У выніку недахвату насеньня для забесьпячэньня вызначаных плянам 1932 г. плошчаў засеву—абавязаць райкомы, РВК, зямельныя і загатоўчыя арганізацыі правесьці загатоўку насеньня ў раёне звыш цэнтралізаванага пляну загатовак для поўнага пакрыцьця патрэб у насеньні.

2. Абавязаць зямельна - калгасныя арганізацыі, РВК, гарсаветы, райкомы і гаркомы скончыць да 20-га сакавіка ачыстку насеньня і сартаабмен згодна ўстаноўленых плянаў.

3. Абавязаць зямельныя органы, Белкалгаснасенсаюз, Хлебжывсаюз, Садсаюз, Ільнасаюз і Белкаапсаюз пад асабістую адказнасьць кіраўнікоў гэтых устаноў перабудаваць мэтады работы загатовак з тым, каб ахапіць загатоўкамі гэтых культур усе калгасы, вёскі і паселішчы, арганізуючы карабейнікаў і зборшчыкаў насеньня, прыцягнуўшы да гэтай справы ўсе камсамольскія, прафсаюзныя арганізацыі і жанчын, устанавіўшы форму аплаты загатаўцелям і зборшчыкам насеньня, якая-б стымулявала іх работу па загатоўцы насеньня і засыпцы фондаў.

4. Абавязаць Насенсаюз, зямельныя органы, РК і РВК у дэкадны тэрмін праверыць выкананьне кантрактацыйных дагавароў з боку калгасьнікаў і аднаасобнікаў, патрабаваўшы неадкладнага іх выкананьня, з Калгасцэнтру і яго сыстэмы ў гэты-ж тэрмін вытвараць поўны абмалот насеньня, як зерневых культур, так і пасеўных траў і поўнасьцю здаць іх па кантрактацыйных дагаварох.

5. Адзначаючы наяўнасьць у радзе раёнаў псаваньня ў капцох бульбы, абавязаць зямельна-калгасныя арганізацыі, РК і РВК вытварыць шырокі агляд бульбахавальнікаў і пры малейшай адзнацы псаваньня бульбы арганізаваць пераборку і належнае хаваньне, перакінуўшы папсаваную бульбу на пераапрацоўку ў прамысловасьць.

6. Абавязаць Наркамзем арганізаваць 5-ці дзённую справаздачнасьць аб ходзе загатоўкі і засыпкі насеньня даручыўшы РКК прасачыць як за ходам засыпкі фондаў, так і за сваячасовым прадстаўленьнем патрабуемых зводак і правільнасьцю іх складаньня.

7. Даручыць т. Рачыцкаму і Міцькову арганізаваць праверку выбарчым шляхам сапраўднай наяўнасьці і хаваньня насенных фондаў у саўгасах і калгасах, скончыўшы гэтую работу не пазьней 1-га сакавіка.

8. Лічыць мэтазгодным разгарнуць работу сярод калгасьнікаў аб арганізацыі ўзаемнай дапамогі насеньнем тым калгасам, у якіх пры поўнай мабілізацыі ўласных рэсурсаў выяўляецца недахват.

Калгасцэнтру і райкомам устанавіць парадак і ўмовы насеннай узаемадапамогі паміж калгасамі.

9. Пасьпяховасьць поўнай мабілізацыі насенных фондаў, засыпка і загатоўка іх будзе залежаць выключна ад таго, як партыйныя, зямельныя, савецкія і калгасна-каапэрацыйныя арганізацыі, цэнтральны і мясцовы друк змогуць разгарнуць масава-палітычную работу навокал гэтай важнейшай палітычна-гаспадарчай задачы, увязаўшы яе з арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў.

10. Побач з адказнасьцю зямельных, каапэрацыйных, савецкіх і партыйных арганізацый за пасьпяховую падрыхтоўку і арганізацыю сяўбы для больш хуткага вырашэньня раду пытаньняў з падрыхтоўкай і правядзеньнем сяўбы,—абавязаць райкомы арганізаваць пасеўныя тройкі ў складзе: сакратара райкому, старшыні РВК, рай ЗА.

Калгас імя Блюхера—прыклад ўдарнай работы

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Калгас імя Блюхера зьяўляецца адным з перадавых калгасаў Бабруйскага раёну. Калгас разгарнуў баявую падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Пляны веснавой пасеўнай кампаніі прапрацаваны на сходах калгасьнікаў, выдучаны адказныя асобы з членаў праўленьня і калгаснага актыву за збор і ачыстку насенных фондаў, за рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтара і іншыя работы.

Поўнасьцю створаны насенны фонд зярнёвых культур і бульбы. Створаны страхавы фонд у разьмеры 15 проц. ад агульнага фонду. Насеньне зярнёвых культур яшчэ з восені прапушчана праз трыер і падрыхтавана да пасеву.

Калгас мае садова-гародна-ягадны ўхіл. З гэтае прычыны ён значна пашырае сёлета пасевы пад бульбаю, гароднінай. З прычыны недахвату бульбы, калгас мяркуе папаўняць насенны фонд бульбы, шляхам рэзкі яе. Зараз у калгасе разгорнута работа па загатоўцы насеньня гародных культур.

Два тыдні таму назад калгас скончыў рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтара. Плугі ўжо адрамантаваны. Вылучана брыгада цесьляроў па рамонце калёс і брыгада рымароў па рамонце збруі і падгонцы яе да коняй.

Калгасам праведзена разьмеркаваньне коняй па парках. Тыя коні, якія будуць скарыстаны на больш цяжкіх работах у часе веснавой пасеўнай кампаніі, пастаўлены ў асобнае памяшканьне і іх лепш кормяць.

На час веснавой пасеўнай кампаніі забраніяваны фонд моцных кармоў і сена.

Актыўная работа праводзіцца па падрыхтоўцы парнікоў.

Калгас прыняў нормы выпрацоўкі на 1932 г. У гэтай справе прымалі актыўны ўдзел усе калгасьнікі. Пры ўстанаўленьні норм браўся курс на выпрацоўку такіх норм, якія-б адпавядалі выпрацоўцы лепшага калгасьніка-ударніка.

Брыгадны мэтад працы і ліквідацыя абязьлічкі ў калгасе забясьпечылі ўмацаваньне калгаснай вытворчасьці, узьнялі працоўную дысцыпліну, далі магчымасьць шырока разгарнуць падрыхтоўку да сяўбы. Калгас павінен замацаваць дасягнутыя посьпехі і яшчэ шырэй разгарнуць бальшавіцкую падрыхтоўку да сяўбы.

А. Дамброўскі.

Даць плянавыя заказы—

патрабуе завод імя Ланцуцкага ад дырэкцыі Заходніх дарог

Завод імя Ланцуцкага вырабляе запасныя часткі для чыгуначных раёнаў. Ад ступені забесьпячэньня чыгункі запаснымі часткамі залежыць колькасьць і якасьць вагона-паравознага парку. Але дырэкцыя Заходніх дарог не дае заводу плянавых заказаў, чым зрывае выраб запасных частак. У неадкладным парадку дырэкцыя павінна даць прапрацаваны плянавы заказ, які поўнасьцю забясьпечыў-бы патрэбы вузлоў.

Аб тэй коснасьці і безадказнасьці, што панавалі ў апараце дырэкцыі Заходніх чыгунак, у свой час мы пісалі. Сёньняшні матэр'ял таксама надзвычай характэрны, каб рабіць заключэньне аб тым, у якой меры дырэкцыя Заходніх чыгунак выконвае загад тав. Андрэева аб палепшаньні кіраваньня чыгуначным транспартам.

Дырэкцыя Заходніх чыгунак цалкам нясе адказнасьць за становішча на тых вузлах і ў раёнах чыгункі, якія знаходзяцца пад яе непасрэдным кіраўніцтвам. Дырэкцыя, у прыватнасьці, цалкам адказвае за забесьпячэньне чыгунак запаснымі часткамі, ад наяўнасьці якіх залежыць добраякаснасьць цягніковага і вагоннага паркаў. З тымі заводамі, якія запасныя часткі даюць, дырэкцыя павінна мець асабліва шчыльную, асабліва істотную і практычную сувязь.

Факты з Гомельскага вагона-будаўнічага заводу сьведчаць аб тым, што гэтай сувязі няма. Больш таго. Ёсьць перашкоды, якія стварае дырэкцыя для выкананьня заводзкай праграмы па вырабе запасных частак. Ёсьць поўная незацікаўленасьць сваёй справай, адчайлівы бюракратызм, коснасьць, якія перарасьлі ў злачынныя адносіны да забесьпячэньня чыгункі запаснымі часткамі.

У дырэкцыі ёсьць папярова-цыркулярныя патокі, праз якія яна ня можа бачыць сапраўднае становішча на чыгунцы. Дырэкцыя вырабам запасных частак кіруе «наогул», бяз усякай апэрацыйнасьці, бяз унікненьня ў кожную дробную дэталь работы.

Завод за ўвесь час ні разу не атрымаў ад дырэкцыі правільна складзенага заказу на запасныя часткі. Заказы не забясьпечвалі сапраўдных патрэбы чыгункі. Заказы часамі даваліся на такую колькасьць дэталяў (як, напрыклад, калодкі), якіх хапіла-б на некалькі год наперад. Давалася такая колькасьць разрозьненых (адзінічных) заказаў, што мадэлі для іх каштавалі-б больш, чымся самі дэталі.

Дырэкцыя ніяк не магла ўлічыць патрэбы чыгункі. Не магла ўлічыць таму, што не прапрацавала заказаў сярод масы чыгуначнікаў, не змагла атрымаць правільных заявак ад раёнаў, бо і тых не навучыла масава распрацаваць плянавыя заказы.

Сыгнал з Гомельскага чыгуначнага вузла зьяўляецца такім сыгналам, які патрабуе карэннай перабудовы работы дырэкцыі. Сыгнал, які патрабуе неадкладнага выкананьня загаду тав. Андрэева аб палепшаньні кіраваньня чыгуначнага транспарту.

Партарганізацыя дырэкцыі Заходніх чыгунак, партарганізацыі ўсіх вузлоў павінны рашучым чынам зьнішчыць тыя недахопы, аб якіх ідзе тут гутарка. Дырэкцыя Заходніх чыгунак павінна зрабіцца апэрацыйным штабам па кіраўніцтве раёнамі і вузламі. Гэта ў поўнай меры залежыць ад выкананьня загаду т. Андрэева аб карэнным і істотным палепшаньні кіраваньня на чыгуначным транспарце.

...—сьлесар т. **МІРОНЧЫК** напраўляе восевыя стаканы.

Завод не атрымаў плянавага заказу на запасныя часткі

Дырэкцыя Заходніх працуе бясплянава

ГОМЕЛЬ. Завод імя Ланцуцкага выконвае заказы на запасныя часткі для Заходніх чыгунак. Па сваёй вытворчай магчымасьці ён прадстаўляе сабою нявычэрпную крыніцу для забесьпячэньня транспарту ўсімі неабходнымі часткамі. Тут неабходна толькі гібкасьць з боку самой заказчыцы-чыгункі.

Але якраз гэтай гібкасьці дырэкцыя Заходніх і не праяўляе.

Калі завод выконвае і перавыконвае заказы чыгункі, дык апошняя сама зрывае працу заводу.

У мінулым годзе дырэкцыя Заходніх заключыла дагавор з заводам на выраб запасных частак толькі ў красавіку. Але нават і па гэтым дагаворы заказы былі значна паменшаны супроць сапраўдных патрэб чыгункі. Заказ не прадугледзіў выраб усіх неабходных матэр'ялаў для дэпо і станцыі, а ў выніку за 9 месяцаў мінулага году на завод паступіла яшчэ па-за плянам 3.800 індывідуальных заказаў. Ці трэба гаварыць аб тым, як такая бясплянавасьць зрывае працу заводу, ці падкрэсьлівае ўсю бюракратычнасьць і фармальны падыход з боку дырэкцыі да складаньня пляну.

Гэта пацьвярджаецца многімі прыкладамі. Дырэкцыя дала заводу заказ на адліўку 70.000 калодак сэрыі ЭГ. Плянавы аддзел заводу, улічваючы патрэбнасьць чыгункі, паказаў дырэкцыі Заходніх на тое, што гэта вельмі перавышаны заказ. Але дырэкцыя свой заказ падцьвердзіла. Завод выкінуў на склады чыгункі 14.000 калодак і заваліў імі ўсе склады дарогі, даўшы калодак на некалькі год. І толькі тады ў дырэкцыі схапіліся за галовы. Але пакуль дырэкцыя адмяніла свой заказ, завод адліў яшчэ 19.000 калодак.

На гэты год дагавор з заводам яшчэ не заключаны. Дырэкцыя яшчэ толькі прыслала ў завод папярэднія лічбы, з якіх відаць, што і гэты заказ таксама ня ўлічвае ні магчымасьці заводу, ні патрэбнасьці дарогі.

Справа ў тым, што пасьля пераходу заводу ў ВОРЗ, усе мадэлі на дэталі паравозаў сэрыі С, Щ, СУ, Э былі адпраўлены на іншыя заводы; у прыватнасьці на Канатопскі. Але дырэкцыя Заходніх гэтага зусім ня ўлічыла і накіравала заводу імя Ланцуцкага заказы на дэталі гэтых сэрый. 80 проц. з гэтых дэталяў адзінічныя і калі завод будзе іх вырабляць, дык адзін кілёграм ліцьця будзе каштаваць для чыгункі 80 кап., гэта з таго разьліку, што выраб дэталяў будзе каштаваць 20.000, выраб мадэляў для іх адліўкі—40.000 р.

А між тым, той-жа самы Канатопскі завод мог-бы выканаць заказ чыгункі і значна хутчэй і значна таньней. Такі заказ інакш як шкодніцкім лічыць нельга.

Завод аказвае дапамогу

Калі завод імя Ланцуцкага атрымаў ад ВОРЗ'у прамфінплян на 1932 год, дык для заказаў Заходніх чыгунак ня было адведзена ніводнага месца. Тлумачыцца гэта той-жа самай коснасьцю і бюракратызмам апарату дырэкцыі Заходніх.

Але і тут завод пайшоў насустрач патрэбам транспарту. Ня гледзячы на адсутнасьць дагавору на выраб запасных частак, завод па ўласнай ініцыятыве адліў і здаў на склады чыгункі 7.984 дэталі паравозных і вагонных запасных частак. Гэтыя дэталі выпушчаны заводам за 26 дзён студзеня.

Старая руціна, якая разьядае працу транспарту, адбіваецца таксама і на справе ўзмацненьня працы раёнаў.

Для абменных пунктаў і рамонту паравозаў патрабуецца шмат запасных частак. Раённае кіраўніцтва здало свае гадавыя заяўкі ў дырэкцыю чыгункі і на гэтым супакоілася. Аддзел забесьпячэньня Гомельскага раённага кіраўніцтва на чале са Сьмірновым зусім ня цікавіцца адкуль і ў якія тэрміны павінны прыбываць заказаныя для Гомелю запасныя часткі. Сьмірноў ведае, што дырэкцыя дзесь ці заказала запасныя часткі, а таму і лічыць для сябе зусім не абавязковым клапаціцца аб хутчэйшым атрыманьні іх.

Гэткае становішча давяло да таго, што зараз у дэпо Гомель стаіць некалькі паравозаў у чаканьні рамонту. Процант хворых паравозаў узьняўся да 23. А на абменных пунктах заплаціў штрафаў за няспраўныя вагоны 205.931 р. толькі за дзьве дэкады студзеня.

Кіраўнікі раённага праўленьня, як і дэпо зусім не рэагуюць на такое становішча з забесьпячэньнем іх запаснымі часткамі. Яны спадзяюцца выключна на дырэкцыю чыгункі. А з прычыны таго, што самастойнасьць раёнам ня дадзена, мы маем такія факты.

Для абменных пунктаў патрэбна шмат падшыпнікаў. Для рамонту яны паступаюць у завод. Завод патрабуе ад галоўнага складу бабіт для заліўкі. Склад без дазволу Калугі бабіт не выдае. І атрымліваецца такое становішча, калі шкодніцкія застарэлыя ўстаноўкі чыгункі зрываюць перавозкі. Вагоны стаяць без падшыпнікаў, падшыпнікі ляжаць не залітымі, а бабіт ляжыць на складзе, бо ніхто яго [illegible] выдаваць.

Альбо ўзяць напрыклад электраэнэргію. За тры апошніх месяцы 1931 году ў дэпо-сартыровачным варштаты прастаялі з прычыны недахопу энэргіі 1826 чалавек-гадзін.

Каб выйсьці з такога становішча, завод ужо амаль два гады як прапанаваў дырэкцыі Заходніх, каб усе чыгуначныя ўстановы перавесьці на пераменны ток, а таксама зрабіць асобныя рубільнікі для асьвятленьня і для варштатаў. Гэта дало-б магчымасьць пазьбегнуць прастою варштатаў. Але справа гэта ня зроблена яшчэ і дагэтуль.

Не на таго ўзвалілі віну

Зваліўшы ўсю віну ў недахопе частак на завод, кіраўнікі дэпо раёну не заняліся мабілізацыяй унутраных рэсурсаў. Прыклад з рэсорамі. Паасобныя кіраўнікі скардзіліся на недахоп рэсор. На складах у гэты час былі неабходныя для дэпо 12 і 13 лістовыя рэсоры, а таксама і дэфіцытнае медная ліцьцё.

Заказаўшы заводу рамонт 885 рэсор, дэпо дало толькі 300 рэсор. Сталі для рамонту іх зусім ня далі.

Зараз ліцейны цэх заводу можа прыняць заказ на 3220 тон ліцьця, замест 72 тон, якія мяркуе заказаць на гэты год дырэкцыя Заходніх. Кавальскі цэх можа даць транспарту пакоўку. Акрамя таго, на заводзе ёсьць шмат гатовай прадукцыі і толькі трэба, каб чыгуначнікі прышлі на завод і ўзялі ўсе патрэбныя ім запасныя часткі.

Чыгуначнікі павінны наладзіць з заводам шчыльную сувязь, каб ня толькі яны ведалі, што дае ім завод сёньня ці заўтра, але каб і завод ведаў, якія заказы трэба выканаць у першую чаргу.

Партыйная і прафэсыянальная арганізацыі заводу, разам з рэдкалегіяй шматтыражкі, абавязаліся мабілізаваць рабочы калектыў заводу на поўнае і сваячасовае выкананьне ўсіх заказаў транспарту.

Л. С—ч.

П. Горын

ЯК І НАД ЧЫМ ПРАЦУЕ БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК

Пэрыяд ад XIII да XIV зьезду КП(б)Б быў пераломным у жыцьці Беларускай Акадэміі Навук, якая калісьці была аплотам нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў, у сучасны момант пад кіраўніцтвам партыі ператварылася ў адну з буйнейшых навуковых устаноў нашага Саюзу, паставіўшы сваёй задачай шчыльнейшую ўвязку навукі з сацыялістычным будаўніцтвам. Параўнаўча хуткая ліквідацыя той шкоды, якую прынесла Акадэміі мінулае нацыянал-дэмакратычнае кіраўніцтва і ператварэньне Акадэміі ў нашу пралетарскую Акадэмію сталі магчымымі выключна дзякуючы той ўвазе, якую пралетарская грамадзкасьць аддавала Акадэміі.

За мінулы год Акадэмія значна папоўнілася новымі навуковымі кадрамі. Аб гэтым сьведчаць агульныя даныя аб росьце колькасьці навуковых работнікаў Акадэміі. Так да пачатку 1931 г. у Акадэміі Навук працавала 8 акадэмікаў, 39 вучоных спэцыялістаў і 29 навуковых супрацоўнікаў. Зараз працуе 17 акадэмікаў, 65 вучоных спэцыялістаў і 53 навуковых супрацоўнікаў, г. зн. за год навуковыя кадры Акадэміі ўзрасьлі на 59 чалавек, ня лічачы навукова - дапаможнага пэрсаналу. У гэты-ж лік не ўваходзіць таксама і створаная ў 1931 г. пры Акадэміі асьпірантура ў ліку 285 чалавек.

Да ліку буйных дасягненьняў Акадэміі трэба аднесьці вялікае папаўненьне Акадэміі камуністычнымі навуковымі кадрамі. Раней ў Акадэміі камуністы налічваліся адзінкам. Зараз-жа камуністычная праслойка сярод навуковых работнікаў Акадэміі дасягае 44 проц. у той час, як па ўсёй БССР яна дасягае крыху больш 20 проц. Камуністычны склад навуковых работнікаў Акадэміі зьяўляецца лепшай парукай таго, што Акадэмія справіцца з тымі задачамі, якія стаяць перад ёю ў справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Умацаваньне Акадэміі камуністычнымі кадрамі дазволіла ёй правесьці пасьпяховую барацьбу з нацыянал - дэмакратычнай спадчынай. Нацыянал-дэмакратычныя элемэнты, якія акапаліся ў Акадэміі, як вядома, зрабілі вялізарную шкоду сацыялістычнаму будаўніцтву БССР. Імкнучыся выдаць сябе за будаўнікоў беларускай культуры, нацыянал - дэмакраты на самой справе былі яе горшымі ворагамі, бо падрыхтоўвалі працоўным масам БССР рэстаўрацыю капіталістычнага прыгнечаньня і ставілі сваёй задачай ператварыць БССР у калёнію польскага імпэрыялізму. Прыкрываючыся шырмай навукі, нацыянал - дэмакраты, на самой справе, былі яркімі рэакцыянэрамі і ў галіне навукі.

Першая задача, якая паўстала перад новай Акадэміяй, было выкрыцьцё шкоднай контр - рэвалюцыйнай работы беларускага нацыянал - дэмакратызму.

У канцы 1930 году і пачатку 1931 г. поруч з барацьбой супроць вялікадзяржаўніцкіх установак Акадэмія Навук асаблівую ўвагу канцэнтруе на барацьбе і выкрыцьці нацыянал - дэмакратычных канцэпцый. Былі створаны брыгады па крытычным пераглядзе нацыянал - дэмакратычнай прадукцыі, праведзены шматлікія даклады з крытыкай нацыянал - дэмакратычных установак у галіне філёзофіі, літаратуры, гісторыі, эканомікі, мовы, краязнаўства і г. д. Гэтая работа Акадэміі шырока папулярызавалася ў выглядзе выданьня цэлага раду зборнікаў і шматлікіх часопісных і газэтных артыкулаў, выкрываючых контррэвалюцыйную сутнасьць нацыянал-дэмакратызму.

Аднačасова з крытыкай нацыянал-дэмакратызму, Акадэмія прыступіла да перагляду плянаў сваёй навукова-дасьледчай работы. Тэматыка старой Акадэміі апрача таго, што распрацоўвалася ў духу нацыянал-дэмакратызму, ставіла таксама сваёй задачай адцягнуць навуку ад распрацоўкі актуальных пытаньняў сучаснасьці, што па сучаснасьці зьяўлялася шкодніцтвам на навуковым фронце. Асноўная задача, якая востра паўстала перад новым кіраўніцтвам Акадэміі—гэта перагляд тэматыкі нашай навуковай прадукцыі пад кутом погляду неабходнасьці самай шчыльнейшай увязкі з сацыялістычным будаўніцтвам. Трэба было таксама правесьці барацьбу з той коснасьцю, якая была сярод некаторай часткі навуковых кадраў, што быццам навуковая распрацоўка сучасных пытаньняў немагчыма, што гэта прыніжае навуку, што навука «апалітычная» і «аб'ектыўная» і т. п. Ужо мінулая дзейнасьць нацыянал-дэмакратычнай Акадэміі лішні раз пацьвердзіла, што навука не зьяўляецца аб'ектыўнай і па-за клясавай.

Паны нацыянал-дэмакраты Цьвікевічы, Лёсікі, Ластоўскія і Некрашэвічы як ні стараліся прыкрыцца сваёй «акадэмічнасьцю» на справе зьяўляліся ўзорамі буржуазнай фальшы, якія свае контр-рэвалюцыйныя мэты імкнуліся прыпрыхнуць пад абаронай «аб'ектыўнасьці» навукі. Гэтыя паны яшчэ раз навочна пацьвердзілі становішча марксызму, што ўсякая навука клясавая, нават здавалася-б у такой «бяскрыўднай», галіне, як мовазнаўства. Мы ведаем толькі адну ў сапраўдным сэнсе слова аб'ектыўную навуку—марксыцкую навуку, якая служыць справе пралетарыяту і зьяўляецца аб'ектыўнай навукай, бо ставіць сваёй задачай барацьбу за ліквідацыю капіталістычнай эксплёатацыі, барацьбу за сацыялізм. Рашучая барацьба за чыстату марксыцкай мэтадалёгіі была пакладзена ў аснову навукова-дасьледчай работы новай Акадэміі. Ліст тав. **Сталіна** ў рэдакцыю «Пролетарской Революции» патрабуе ад нас яшчэ большай пільнасьці ў нашай навуковай прадукцыі. Мы ня можам дапускаць самых нязначных скажэньняў марксавай тэорыі, якая толькі дазваляе нам глыбока навукова вывучаць самыя актуальныя пытаньні сучаснасьці. Як вядома, карыстаючыся марксыцкай мэтадалёгіяй, Ленін літаральна па пятах разьвіцьця рускага капіталізму даў такую непераможную глыбока навуковую працу, як «Разьвіцьцё капіталізму ў Расіі», у самым працэсе разьвіцьця рэвалюцыі 1905 г. Ленін уласна напісаў яе гісторыю, якая дагэтуль зьяўляецца асновай для вывучэньня гісторыі нашай першай рэвалюцыі. Толькі вядучы распрацоўку сучасных праблем на аснове марксісцка-ленінскай дыялектыкі, мы сапраўды будзем у стане пасьпяхова распрацаваць тую тэматыку, над якой працуе сучасная Акадэмія і якая намі была перагледжана з пункту погляду шчыльнейшай увязкі навукі з задачамі сучаснага сацыялістычнага будаўніцтва. Мы ня можам, аднак, прызнаць, што Акадэмія ўжо вырашыла задачу шчыльнейшай увязкі навукі з сучасным сацыялістычным будаўніцтвам. Барацьба за шчыльнейшую ўвязку навукі з сучасным сацыялістычным будаўніцтвам і максымальнае скарыстаньне навуковых дасягненьняў у справе будаўніцтва сацыялізму стаіць у цэнтры нашай увагі і пры складаньні плянаў навукова-дасьледчай работы на 1932 год.

Апошняя пастанова ЦК КП(б)Б, па якой кіруючыя работнікі Акадэміі і дырэктары навукова-дасьледчых інстытутаў уключаюцца ў калегіі наркаматаў і адпаведных гаспадарчых арганізацый, забясьпечвае нагляд за тым, каб навуковыя дасягненьні Акадэміі сваячасова ператвараліся ў практыку сацыялістычнага будаўніцтва.

У бягучым годзе навукова-дасьледчая работа Акадэміі атрымлівае шырокі размах. Па ўсіх інстытутах Акадэміі ў 1932 г. намечана для распрацоўкі больш 300 тэм, з якіх на долю натуральных навук прыпадае 118 тэм. Паводле пляну 1932 г. намечана да выданьня 231 работа. Выдавецкі плян вырос больш 1.000 друкаваных аркушаў. У гэты выдавецкі плян аднак не ўваходзіць перавод на беларускую мову клясыкаў-марксызму.

Сярод тэм, над якімі зараз працуе Акадэмія, галоўная ўвага аддаецца вывучэньню пытаньняў, як праводзіць у жыцьцё 6 умоў тав. **Сталіна**, праблема спэцыялізацыі БССР у сыстэме СССР, вывучэньне праблем зьвязаных з заканчэньнем чацьвертага году першай пяцігодкі і намячэньне наступнай пяцігодкі, сучасная клясавая барацьба, нацыянальнае пытаньне ў рэканструкцыйны пэрыяд, крытычны разбор работ Р. Люксэмбург, буржуазныя тэндэнцыі ў сучаснай беларускай мастацкай літаратуры, клясавая барацьба ў сучасным мовазнаўстве, падрыхтоўка нарысаў па гісторыі Беларусі, манографічнае вывучэньне фабрык і калгасаў, роля сельсаветаў у калгасным будаўніцтве, праблема электрыфікацыі БССР, вывучэньне глебаў БССР, вывучэньне запасаў бурых жалезьнякоў, вывучэньне торфу, распрацоўка захворваньня бульбы, фітапаталёгічнае, энтамалёгічнае і фізіялёгічнае вывучэньне масных культур БССР, вывучэньне ўмоў культуры Соі ў БССР, вывучэньне шкоднікаў буйнай жывёлы, гідрабіялёгічнае вывучэньне вадаёмаў у БССР, вывучэньне расьліннай сыравіны для прамысловасьці, дынаміка форм кіслотнасьці па глебавых тыпах у розных севазваротах, фізіка-хімічныя ўласьцівасьці балотных глебаў.

Як бачым большасьць тэм, над якімі працуе Акадэмія, мае самыя непасрэдныя адносіны да нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Вывучэньне гэтых пытаньняў, зразумела, не выключае пастаноўку ў Акадэміі праблем, якія нібы ў даны момант ня маюць непасрэдна практычнага значэньня, але якія ў сапраўднасьці прадстаўляюць вялізарнае значэньне, для далейшага разьвіцьця навукі. Так, у Акадэміі вядзецца вывучэньне электрона.

У плянах работ Акадэміі асаблівая ўвага аддана вывучэньню нацыянальнага пытаньня і ў бягучым годзе значна пашырана работа нацыянальных сэктароў. Разгортваецца таксама работа і ў камісіі Заходняй Беларусі, якая галоўную ўвагу сваёй работы фіксуе над вывучэньнем сучаснага эканамічнага стану і клясавай барацьбы ў Заходняй Беларусі.

Тыя задачы, якія паставіла сабе новая Акадэмія, ачышчаная ад нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў, натуральна патрабавалі арганізацыйнай перабудовы. Раней існаваўшыя шматлікія камісіі, сэкцыі, аддзелы ў сучасны момант рэарганізаваны ў інстытуты. Зараз у Акадэміі існуе 12 навукова-дасьледчых інстытутаў (філёзофіі, эканомікі, гісторыі, савецкага будаўніцтва і права, літаратуры і мастацтва, мовазнаўства, фізіка-тэхнічны, хімічны, геалёгічны, агра-глебавы, біялёгічных навук, нэўралёгічны). Апроч таго існуюць 4 нацыянальных сэктары (польскі, яўрэйскі, літоўскі і латыскі) і камісія па Заходняй Беларусі. У сувязі з разгортваньнем масавай работы створаны спэцыяльны сэктар масавай работы. У 1931 годзе створан таксама інстытут асьпірантуры, у якім падрыхтоўваецца каля 300 навуковых работнікаў. Пры Акадэміі ёсьць бібліятэка, выдавецтва і батанічны сад. Сучасная арганізацыйная структура Акадэміі дазваляючая ёй шчыльна ўвязвацца з нашымі гаспадарчымі органамі, забясьпечвае таксама праводзаньне ў жыцьцё рашэньня СНК, даручыўшага Акадэміі плянаваньне і кантроль над усёй навукова-дасьледчай работай БССР. Трэба аднак адзначыць, што рашэньне СНК, паводле якога Акадэмія Навук павінна стаць адным рэспубліканскім навуковым цэнтрам, у якім канцэнтруецца плянаваньне і кантроль навукова-дасьледчай работы БССР, намі далёка яшчэ не праведзена ў жыцьцё. Ліквідацыя саматужніцтва і паралелізму, маючыя яшчэ месца ў нашай навуковай рабоце, зьяўляецца самай актуальнай задачай, якая павінна быць вырашана Акадэміяй ў бягучым годзе.

Апошняя пастанова ЦК КП(б)Б аб Беларускай Акадэміі асаблівую ўвагу аддае неабходнасьці самай рашучай барацьбы за рэалізацыю пастановы СНК БССР аб ператварэньні Акадэміі ў адзіны рэспубліканскі навуковы цэнтр, які ажыцьцяўляе плянаваньне і кантроль над навукова-дасьледчай работай у БССР.

Гаворачы аб чарговых задачах, якія ва ўвесь рост зараз стаяць перад Акадэміяй, неабходна адзначыць параўнаўча слаба разьвітую масавую работу Акадэміі. Ва ўмовах рэканструкцыйнага пэрыяду, калі, як адзначыў тав. Сталін, «навука і тэхніка вырашаюць усё», Акадэміі неабходна шырака разгарнуць масавую работу па прапагандзе навуковых ведаў сярод шырокіх мас. У выдавецкім пляне Акадэміі на 1932 год намечана да выданьня 628 папулярных брашур (разьмерам ад чвэрці да аднаго друкаванага аркуша) і будзе зачытана па фабрыках, заводах і калгасах 128 папулярных дакладаў. Апроч таго выдаваемы Акадэміяй часопіс «Савецкая краіна» рэарганізуецца ў масавы часопіс па прапагандзе навуковых ведаў. Наяўнасьць пры Акадэміі Цэнтральнага Бюро краязнаўства дазваляе Акадэміі зьвязвацца з самымі шырокімі масамі.

Сярод іншых актуальных праблем, якія стаяць перад сучаснай Акадэміяй, востра стаіць праблема навуковых кадраў. Ужо выкананьне першай пяцігодкі выявіла вострыя недахоп навуковых сіл. Задачы другой пяцігодкі праблему навуковых кадраў ставяць яшчэ вастрэй. Пры падрыхтоўцы навуковых кадраў неабходна мець на ўвазе, што падрыхтоўка кваліфікаванага навуковага работніка звычайна працягвае больш дзесятку год. У сувязі з гэтым мы зараз-жа павінны паставіць ва ўвесь рост праблему падрыхтоўкі нашых пралетарскіх навуковых сіл, неабходных нам для чарговай і наступных пяцігодак. На падрыхтоўку навуковых кадраў Акадэміяй зьвернута вялізарная ўвага. Стварэньне Інстытуту Асьпірантуры, у якім у сучасны момант падрыхтоўваецца да 300 навуковых работнікаў, бязумоўна, мае вялізарнейшае значэньне для ўсёй нашай рэспублікі. У бліжэйшы-ж час нам неабходна будзе скласьці пяцігодку падрыхтоўкі навуковых кадраў і наладзіць справу з падрыхтоўкай асьпірантуры, якая знаходзіцца пры навукова-дасьледчых установах, не ўваходзячых у сыстэму Акадэміі.

У лік асноўных, вастрэйшых задач, якія стаяць перад усімі навуковымі работнікамі БССР і ў прыватнасьці перад Акадэміяй, трэба аднесьці барацьбу за падвышэньне кваліфікацыі нашых навуковых кадраў і якасьці нашай навуковай прадукцыі. Задача, якая стаіць перад намі, «дагнаць і перагнаць» у тэхнічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны можа быць вырашана толькі пры ўмове падвышэньня кваліфікацыі нашых навуковых кадраў. Пры гэтым ні на хвіліну нельга забываць, што асваеньне намі навуковых ведаў заграніцы павінна праводзіцца па бальшавіцку, г. зн. так, каб ня толькі асвоіць гэтыя веды, але і ўмець прымяняць іх у нашых умовах сацыялістычнага будаўніцтва.

Пытаньні электрыфікацыі нашай краіны, стварэньне нябачаных яшчэ ў гісторыі буйных прамысловых гігантаў і буйных сельска-гаспадарчых прадпрыемстваў могуць быць намі вырашаны, калі мы перагонім навуковую думку заграніцы. У шмат якіх галінах навуковых ведаў мы гэта ўжо зрабілі. Але перад намі стаяць яшчэ новыя, нябачаныя ў гісторыі цяжкія задачы, з якімі мы лёгка справімся таму, што дыктатура пралетарыяту пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, даўшая буйны росквіт навуковай думкі ў БССР, забясьпечвае і яе да-

Ліквідаваць адставаньне

ў рэалізацыі акцый Трактарацэнтру

Як і раней рэалізацыя акцый Трактарацэнтру праходзіць чарапашымі тэмпамі: заданьне 1-га кварталу на 10 лютага выканана ўсяго на 24,9 пр.

Наступаючы матар'ял з месц яскрава сьведчыць аб тым, што ў радзе раёнаў і сельсаветаў на рэалізацыю акцый не зварочваецца належнай увагі. Да гэтага часу ў некаторых раёнах яшчэ не зразумелі таго важнага значэньня, якое мае пасьпяховая рэалізацыя акцый Трактарацэнтру, не зразумелі таго, што ад своечасовай рэалізацыі акцый залежаць посьпехі будаўніцтва МТС.

Пройдзеныя этапы фінансавага паходу не зрабілі рашучага пералому ў рэалізацыі акцый Трактарацэнтру.

Неаднаразовыя дырэктывы ўраду аб прыняцьці вычэрпальных мер да поўнага выкананьня заданьня па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру—і па сёньняшні дзень ня выкананы.

У далейшым такое становішча з рэалізацыяй акцый Трактарацэнтру нецярпіма. Раённыя арганізацыі, і ў першую чару райза, райкалгассаюзы, МТС павінны ў бліжэйшыя-ж дні разгарнуць арганізацыйна-масавую работу сярод насельніцтва і мабілізаваць усю працоўную грамадзкасьць на пасьпяховае выкананьне заданьняў па рэалізацыі акцый. Партарганізацыі павінны рашучым чынам ударыць па тых, хто недаацэньвае значэньня гэтай справы і забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне гэтай кампаніі.

Трэба памятаць, што ад пасьпяховай рэалізацыі акцый Трактарацэнтру залежыць посьпех і будаўніцтва МТС, што ў тых раёнах, якія ня выконваюць заданьняў па рэалізацыі акцый, ня будзе ўтварацца будаўніцтва МТС.

Пры шырокім скарыстаньні фінансавага паходу, пры разгортваньні сацыялістычных мэтадаў работы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва—павінна быць заваявана перамога ў рэалізацыі акцый Трактарацэнтру.

ЦК КП(б)Б т. Гікало, СНК т. Галадзеду наркамфіну БССР т. Хацкевічу

Мы, ударнікі фінансавага фронту Дубровенскага раёну сабраўшыся на зьлёт па пытаньні барацьбы за выкананьне фінпляну ў чацьвертым заключным годзе пяцігодкі, запэўніваем ЦК КП(б)Б, СНК і НКФ БССР што намечаны плян па мабілізацыі фінродкаў у заключным годзе пяцігодкі намі будзе ня толькі выканан, але і перавыканан.

Зараз разьехаўшыся са зьлёту ў калгасы і вёскі, мы мабілізуемся самі і мабілізуем грамадзкасьць, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкую частку аднаасобнікаў на выкананьне і перавыкананьне фінпляну.

На аснове мабілізацыі актыўнасьці мас і перабудовы сваёй работы, паводле 6 умоў т. СТАЛІНА пры бязьлітаснай барацьбе з усякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, пад яе выпрабаваным бальшавіцкім кіраўніцтвам, мы даб'емся бальшавіцкіх перамог у выкананьні фінпляну.

Няхай жыве ленінскае ЦК і яе правадыр т. Сталін.

Няхай жыве другая пяцігодка пабудовы бяскласавага грамадзтва.

Прэзыдыум: Філіпаў, Багданаў, Жалязоўскі, Порын.

Гомель, Рэчыца, Мазыр і Бялынічы за невыкананьне пляну рэалізацыі акцый Трактарацэнтру пазбаўлены права ў першую чаргу атрымаць трактары

Гэтымі днямі калегія НКЗему БССР разглядзела пытаньне аб ходзе рэалізацыі акцый Трактарацэнтру.

Адзначаючы асабліва нездавальняючы ход рэалізацыі акцый Трактарацэнтру ў першым квартале гэтага году, а таксама гадавога заданьня 1931 году па **Мозырскім, Гомельскім, Бялыніцкім, Рэчыцкім, Дубровенскім, Чавускім, Веткаўскім, Петрыкаўскім, Дрысенскім, Капыльскім і Стара-Дароскім** раёнах, Калегія НКЗ пастанавіла папярэдзіць кіруючыя арганізацыі гэтых раёнаў, што невыкананьне плянаў рэалізацыі акцый Трактарацэнтру зрывае пляны будаўніцтва МТС, што яны павінны безадкладна прыняць рашучыя захады да поўнага выкананьня плянаў рэалізацыі акцый Трактарацэнтру.

Апроч гэтага, Калегія НКЗему прапанавала Беладдзяленьню Трактарацэнтру завоз трактароў у **Гомельскі, Мозырскі, Рэчыцкі і Бялыніцкі** раёны зрабіць у другую чаргу. Разам з гэтым, раённыя арганізацыі папярэджваюцца, што ў выпадку нестварэньня ва працягу лютага месяца належнага пералому ў справе рэалізацыі акцый, НКЗем будзе ставіць пытаньне аб зьняцьці будаўніцтва МТС.

За бяздзейнасьць у рэалізацыі акцый Трактарацэнтру Калегія пастанавіла абвясьціць вымову кіраўнікам райза, райкалгассаюзаў і МТС **Дубровенскага, Чавускага, Веткаўскага і Петрыкаўскага** раёнаў.

Сэктару кантролю праверкі НКЗБ і Беладдзяленьню Трактарацэнтру прапанавана на працягу 2-х дэкад праверыць работу райза, райкалгассаюзу і МТС у справе рэалізацыі акцый Трактарацэнтру і высьветліць прычыны сыстэматычнага невыкананьня заданьняў па рэалізацыі акцый па **Дубровенскім, Стара-Дароскім і Капыльскім** раёнах.

Калегія НКЗему прапанавала загадчыкам райза, старшыням райкалгассаюзаў, дырэктарам МТС астатніх раёнаў, у асаблівасьці **Вушацкага, Гарацкага, Гарадоцкага, Крупскага, Вузьдзенскага, Клімавіцкага, Койданаўскага, Чырвонапольскага, Лельчыцкага, Лоеўскага, Любаньскага, Парыцкага, Тураўскага і Магілеўскага**, ў самы бліжэйшы час прыняць вычарпальныя меры да поўнага выкананьня заданьняў па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру.

М. І.

Клімаўшчына ганебна адстае

КЛІМАВІЧЫ. (Наш кар.). Мабілізацыя сродкаў па Клімавіцкім раёне праходзіць зусім марудлівымі тэмпамі. Першы маршрут усебеларускага фінансавага паходу правалены. Студзеньскае заданьне выканана толькі на 85,9 проц. Зусім не разгорнута работа па культзборы. Калгасная сыстэма як і раней ганебна адстае ў мабілізацыі сродкаў.

За студзень месяц па ўступных і мэтавых укладах не паступіла ніводнай капейкі. Райашчадкаса, спажывецкая кааперацыя, лясная кааперацыя і інш. установы і арганізацыі ў правядзеньні фінпаходу бяздзейнічаюць.

У Райфа адсутнічае ўлік паступленьня грашовых сродкаў.

Вопыт пасылкі буксірных брыгад у адстаючыя сельсаветы і калгасы не скарыстоўваецца. Брыгады па перанясеньні вопыту перадавікоў на адстаючыя вучасткі не арганізаваны.

Толькі разгортваньнем ударнай, баявой работы па правядзеньні фінпаходу раён можа і павінен заваяваць перамогу на фінансавым фронце.

П. Кавалёў.

Уключыцца ў фінпаход

Усебеларускі фінансавы паход, які зараз праводзіцца, мае сваёй мэтаю праз уцягненьне ў справу мабілізацыі сродкаў шырокіх мас працоўных, забясьпечыць датэрміновае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў першага кварталу.

Для выкананьня гэтай выключна важнай задачы, калектыў НКФ БССР і кіраўніцтва ашчадкасамі і дзяржкрэдыту вылучылі грамадзкі штаб па правядзеньні фінансавага паходу.

Улічваючы важнае значэньне належнай пастаноўкі работы цэнтральных апаратаў па мабілізацыі сродкаў, калектыў НКФ і кіраўніцтва АК і ДК БССР зьвярнуліся з заклікам да калектываў Усебеларускай Канторы Дзяржбанку, Белкаапсаюзу, Белкалгасцэнтру, Белтрактарацэнтру, Белжыльсаюзу ўключыцца ў фінансавы паход і стварыць грамадзкія штабы па правядзеньні фінансавага паходу і зьвязацца з грамадзкім штабам НКФ з тым, каб сумеснай работай забясьпечыць выкананьне ўсіх плацёжных абавязкаў членамі калектыву, забясьпечыць належнае кіраваньне фінансавым паходам па нізавой сетцы кожнай сыстэмы.

М.

НАМ ЗАСТАЛОСЯ НЯМНОГА: вывучыць тэхніку, аўладаць навукай

„І калі мы зробім гэта, у нас пойдуць такія тэмпы, аб якіх зараз мы ня сьмеем і марыць. І мы гэта зробім, калі захочам гэтага па-сапраўднаму“ (Сталін).

17-я партканфэрэнцыя Ўсе КП(б) адзначыла, што **ажыцьцяўленьне задач тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі непарыўна зьвязана са справай аўладаньня тэхнікай».** Неабходнасьць аўладаньня новымі працэсамі вытворчасьці паставіла па новаму пытаньне аб аўладаньні тэхнікай.

Цэнтральнай задачай нашай прамысловасьці на 1932 год зьяўляецца максімальнае скарачэньне імпарту. Узброіўшыся тэхнічнымі ведамі мы гэтым самым мацуем эканамічную незалежнасьць СССР.

«Бальшавікі павінны аўладаць тэхнікай»,

«тэхніка ў перыяд рэканструкцыі вырашае ўсё».

Гэты заклік тав. Сталіна падхоплены мільёнамі ператвараецца ў вялікія канкрэтныя справы.

Сёньня мы даводзім факты сапраўды гераічнай барацьбы рабочае клясы за тэхнічную незалежнасьць.

Рабочыя Бярэзінскага камбінату ў выніку правядзеньня рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў дасягнулі эканоміі ў 75000 руб. Рабочыя заводу «Пралетары» ў Гомелі выпусьцілі ўжо 2.000 растворамяшалак, якія раней увозіліся з-за мяжы. У фонд эканамічнай незалежнасьці СССР вынаходцы Высоцкі і Дуброўскі (Бабруйск) унесьлі свае каштоўныя прапановы.

Паводле дадзеных (няпоўных) па прадпрыемствах БССР існуюць 589 тэхнічных гурткоў з 21.000 членаў. Гэта праўда нязначная колькасьць, але лічба гэтая расьце з дню ў дзень.

Высунутая прапанова **«Камсамольскай Праўды»** ў сувязі з гадавінай прамовы тав. **Сталіна** аб стварэньні фонду тэхнічна-эканамічнай незалежнасьці СССР ператвараецца ў справу шырачайшых рабочых мас.

На чале гэтага руху павінны стаць партыйныя, гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі. «За аўладаньне тэхнікай, за эканамічную незалежнасьць СССР» павінна стаць лёзунгам барацьбы за сацыялістычнае будаўніцтва разам з няўхільным правядзеньнем у жыцьцё шасьці ўмоў тав. Сталіна, якія зьяўляюцца асновай для далейшых посьпехаў будаўніцтва сацыялізму ў СССР.

Нерэалізаваныя самаабавязацельствы

Узьняць барацьбу за эканамічную незалежнасьць

Пасьля гістарычнага выступленьня тав. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай, у Барысаве разгарнуўся масавы паход за ажыцьцяўленьне ўказаньняў правадыра ў гэтым напрамку.

На фабрыцы «Пралетарская Перамога» арганізаваны гурткі па вывучэньню тэхнікі. Па ініцыятыве ІТР ЦЭС імя Леніна пачалося абучэньне качагараў і манцёраў. Кожны работнік ІТР узяў на сябе абавязак падрыхтаваць аднаго качагара, альбо манцёра. На камбінаце «Камінтэрн» таксама **арганізаваны гурткі па падвышэньню кваліфікацыі рабочых і падрыхтоўцы кваліфікаваных рабочых для работы ва ўноў пабудаваных цэхах (капыльны і мэблявы).**

Раённае бюро ІТР зьвярнулася з адозвай да ўсіх інжынэрна-тэхнічных сіл раёну і рабочых з заклікам узяцца за аўладаньне тэхнікай. Паміж райкомам камсамолу і Райбытам заключаны дагавор на правядзеньне канкрэтных мерапрыемстваў па практычнай рэалізацыі прамовы тав. Сталіна. Арганізаваны вечар рабочай моладзі прысьвечаны аўладаньню тэхнікай.

Наогул было многа слоў, абяцаньняў, шуміхі. Аднак бальшавіцкі пачын ня быў замацаваны. Словы засталіся словамі. І ад усёй праведзенай папярэдняй работы засталіся толькі доўгія рэзалюцыі і нявыкананыя самаабавязацельствы.

Ніхто з узяўшых на сябе абавязацельствы па паходу за тэхніку, іх ня выканаў. У выніку гэтага большасьць гурткоў па вывучэньню тэхнікі не працуюць. Амаль на ўсіх прадпрыемствах Барысаўшчыны тэхвучоба—на задворках.

На фабрыцы «Пралетарская Перамога» з-за тэхнічнай пісьменнасьці рабочых новае імпартнае абсталяваньне выходзіць са строю, як гэта мела месца ў аўтаматным цэху. На камбінаце ёсьць шмат новых рабочых, якія прыходзячы на фабрыку не атрымоўваюць ніякай папярэдняй падрыхтоўкі. Па ўсім камбінаце няма ніводнага тэхгуртка. Арганізаваны вячэрні сярэдні тэхнікум і курсы электраманцёраў разьлічаны ўсяго на 90 чалавек і ні ў якім разе ня змогуць забясьпечыць камбінат кваліфікаванай рабсілай. Менш кваліфікаваныя і чорнарабочыя зусім выпалі з поля гледжаньня арганізацый камбінату. Гэтыя рабочыя ніякімі формамі тэхвучобы не ахоплены. Адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал камбінату зусім ня прымае ніякага ўдзелу ў справе ўкараненьня тэхнікі.

Такое-ж становішча і на камбінаце «Камінтэрн». Мэблявы цэх, абсталяваны імпартнымі станкамі мае больш паломак чым іншыя цэхі. Курсы, якія існуюць выключна для адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу амаль зусім не працуюць.

Адкрытыя 6-цімесячныя курсы на заводах «Пралетарскі Молат» «Чырвоны Мэталіст», мэта якіх (курсаў) зьяўляецца падкаваць рабочага ведамі тэхналёгічнага працэсу ўсіх відаў мэталюргічнай вытворчасьці не працуюць.

Амаль ва ўсіх бібліятэках і клюбах прадпрыемстваў адсутнічае тэхнічная літаратура.

Толькі ў апошнія дні намеціўся пералом ў рабоце па ўкараненьні тэхнікі ў масы. Работнікі ІТН Бярэзінскага камбінату ў сувязі з гадавінай прамовы тав. Сталіна зьвярнуліся з лістом да ўсіх інжынэрна-тэхнічных работнікаў прамысловасьці БССР аб узмацненьні барацьбы за эканамічную незалежнасьць Савецкага Саюзу. Яны прынялі канкрэтныя самаабавязацельствы.

«Мы зьнімаем заказы—пішуць у сваім лісьце работнікі ІТН—на запасныя часткі да імпартнага абсталяваньня машын на суму 28.000 руб. золатам, з іх на 3.000 р. мы абавязваемся зрабіць уласнымі сіламі ў нашай рамонтна-тэхнічнай майстэрні». Яны ўзялі цэлы рад абавязацельстваў у справе беражлівай і правільнай эксплёатацыі маючагася на камбінаце абсталяваньня. Яны ўзяліся стварыць 5 тэхнічных гурткоў па асобных галінах вытворчасьці: аўтаматнаму, эдымальнаму, каробка-эстынеровачнаму цэхам і гурткі для качагараў. Для кіраўніцтва гурткамі прымацаваны інжынэрна-тэхнічныя работнікі адпаведнай спэцыяльнасьці. Пры клюбе яны ўзяліся арганізаваць тэхнічны габінэт, дзе кожны рабочы змог-бы атрымаць адказ на цікавае для яго пытаньне.

Гэты ліст і абавязацельствы інжынэрна-тэхнічных работнікаў Бярэзінскага камбінату будуць мець вялікае практычнае значэньне, калі за практычнае ажыцьцяўленьне гэтага ліста зараз-жа ўзяцца з усёй бальшавіцкай настойлівасьцю.

Актыўнасьць рабочых і іх цяга да аўладаньня тэхнікай значна ўзрасла. Аб гэтым сьведчыць хаця-б вынаходніцкі рух, які ўзрос колькасна і якасна на камбінаце «Чырвоная Бярэзіна». Рабочыя вынаходцы Бярэзінскага камбінату далі за 1931 год 75200 руб. эканоміі. Калі ў першым квартале 1931 г. ад рабочых паступіла 20 прапаноў і ў другім квартале 21 прапанова, дык у трэцім квартале паступіла 31, а ў чацьвертым—58 прапаноў.

Патрэбна толькі ўзначаліць ініцыятыву і энтузіязм рабочых мас і ў аб'яўленым зараз Наркамцяжпромам, УсеЦСПС, ЦК УсеЛКСМ таварыствам «за аўладаньне тэхнікай», месячнік агляду становішча тэхпрапаганды, аўладаньня тэхнікай паказаць сапраўдныя ўзоры бальшавіцкай барацьбы за набыцьцё тэхнічных ведаў.

С.

Замянем імпартнае абсталяваньне савецкім

БАБРУЙСК. (Наш кар.). У адказ на першай гадавіны прамовы т. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай на прадпрыемствах Бабруйску шырока разгарнулася работа па вывучэньні тэхнікі. **Гэтая работа праходзіць пад знакам барацьбы за эканамічную незалежнасьць СССР ад капіталістычных краін, пад лёзунгам замены імпартнага абсталяваньня савецкім.**

Перадавым прадпрыемствам у гэтых адносінах зьяўляецца завод імя Варашылава, рабочыя і інжынэрна-тэхнічны пэрсанал якога, адзначаючы гадавіну прамовы тав. Сталіна, узялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў, галоўнымі з якіх зьяўляюцца: **ахоп тэхнічнай вучобай усіх рабочых, далейшае разгортваньне рацыяналізатарскіх прапаноў.**

Арганізаваны збор рабочых прапаноў у фонд эканамічнай незалежнасьці СССР. У гэты фонд паступіла ўжо 2 вынаходзтва, якія пры іх ажыцьцяўленьні дадуць значную эканомію. Рабочыя-варашылаўцы выклікалі насьледваць іх прыкладу рабочых і ІТР камбінату.

У сваім адказе рабочыя і ІТР камбінату паставілі перад сабой баявую задачу ахапіць усіх вынаходцаў тэхвучобай, уцягнуць у яе большую колькасьць рабочых, разгарнуць работу па прасоўваньні ў масы тэхнічнай літаратуры.

У фонд эканамічнай незалежнасьці СССР унесена 2 вынаходзтвы тав. Высоцкага і Дуброўскага, якія ў значнай ступені дадуць замену імпартнага абсталяваньня. З свайго боку рабочыя і ІТР камбінату ўнесьлі прапанову наладзіць выраб імпартнага абсталяваньня савецкімі заводамі. У прыватнасьці прызнана магчымым наладзіць выпуск малых сушыльных прэсаў для фанэрнай вытворчасьці, бязшумных канічных шасьцяронак для шыпарэзаў, драбілак, лінеек для лушчыльных станкоў і іншага абсталяваньня.

Заводу імя Варашылава, ІТР і вынаходцам прапанавана наладзіць выпуск блёкпрасоў і каленчатых труб для гідраўлічных прэсаў, што ва ўмовах заводу імя Варашылава цалкам магчыма.

Пачын варашылаўцаў і камбінатаў у іх практычнай барацьбе за замену імпартнага абсталяваньня савецкім, за практычнае ажыцьцяўленьне лёзунгу правадыра партыі тав. Сталіна павінен быць падхоплены рабочымі і ІТР машынабудаўнічага заводу імя Сталіна, іншымі фабрыкамі і заводамі Бабруйску і ўсяе Беларусі.

А. Дамброўскі.

91.500.000 пар абутку

павінна даць абутковая прамысловасьць у IV заключным

⊙ 50 ПРОЦ. СЫРАВІНЫ МОЖА ДАЦЬ СЬВІНАЯ СКУРА. ⊙ З КОЖНАЙ СКУРЫ 2 ПАРЫ АБУТКУ. ⊙ БЯЗЬЛІТАСНА ЗМАГАЦЦА З ДРАПЕЖНЫМ ЗЬНІШЧЭНЬНЕМ СКУРЫ—АСМАЛЕНЬНЕМ І АШПАРВАНЬНЕМ. ⊙ ЗА 100 ПРОЦ. СУСТРЭЧНЫ, ЗА 700 ТЫСЯЧ СЬВІНЫХ СКУР.

Увагу на гэты вучастак

Шпаркі рост сацыялістычнага будаўніцтва, а разам з ім палепшаньне матар'яльнага становішча шырокіх працоўных мас патрабуюць у прыватнасьці ад скуранай прамысловасьці павялічэньня выпуску прадукцыі.

Ва ўмовах БССР на прадпрыемствах скураабутковай прамысловасьці будзе перапрацавана 1.130 тысяч сьвіных скур на абутак і розныя скураныя вырабы.

Прадукцыя скуранай прамысловасьці ў БССР у 1932 г. павялічваецца да 62 млн. руб., або на 26 проц. вышэй прадугледжанага пяцігадовым плянам.

Асмальваньне і ашпарваньне сьвіных скур—асноўны біч для скуранай прамысловасьці.

Клясавы вораг агітуе супроць зьняцьця сьвіных скур, распаўсюджваючы чуткі аб тым, што сьвіную скуру нельга здымаць, што бяз гэтага сала нікуды ня варта і г. д.

З гэтымі забабонамі трэба весьці рашучую барацьбу, трэба ўдарыць па гэтай кулацкай хлусьні.

Становішча з забесьпячэньнем прамысловасьці скурсыравінай вельмі напружанае. Кожная папсаваная апаленая сьвіная скура адбіваецца на пасьпяховым выкананьні вытворчых праграм скураных фабрык.

Зьмяшчаючы сёньня матар'ял аб стварэньні сыравіннай базы для скуранай прамысловасьці, мы цалкам падтрымліваем прапанову газэты «Калгасьнік Беларусі», які высунуў сустрэчны па загатоўцы сьвіных скур у 700.000 шт.

Трэба ўзмацніць барацьбу са зрыўшчыкамі дырэктывы ўраду аб забароне асмальваньня і ашпарваньня сьвіных скур. Партыйныя і савецкія арганізацыі, прафсаюзы і камсамол павінны ўключыцца ў гэтую барацьбу, павінны ўзначаліць яе і рашуча змагацца са зрыўшчыкамі загатоўкі сьвіных скур, са зрыўшчыкамі забесьпячэньня нашай прамысловасьці скурсыравінай.

Падтрымаць ініцыятыву „Калгасьніка Беларусі“

У 1932 годзе плян загатоўкі сьвіных скур вызначан у 350.000 па БССР. Разам з тым наяўнасьць скурсыравіны ў БССР дае магчымасьць павялічыць плян загатовак.

«Калгасьнік Беларусі» ў свой час высунуў прапанову аб павялічэньні загатовак на 100 проц. Гэта значыцца, што замест 350.000—700.000 сьвіных скур.

Некаторыя загатоўчыя пункты на месцох падтрымалі гэты пачын і высунулі свае сустрэчныя пляны. Полацкая сетка высунула сустрэчны, які павялічвае квартальны плян па раёне на 200 проц. Сустрэчныя пляны высунуў і Лепельскі раён.

Гадавы арганізаваны забой сьвіней дазваляе высунуць гэты сустрэчны плян і ён магчымы для выкананьня.

Лёзунг выкінуты «Калгасьнікам Беларусі» трэба падтрымаць. З павялічэньнем загатоўкі сьвіных скур мы з аднаго боку забясьпечваем замену тэтай сыравіны за кошт недабору скурсыравіны ад буйнай рагатай жывёлы. Сьвіная скура ў забесьпячэньні праграмы скуранай прамысловасьці павінна заняць 50 проц. усёй сыравіны.

Нізавы друк, рабселькоры, змагаючыся за ажыцьцяўленьне конкурсу «Праўды» на лепшае правядзеньне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, павінны павялічыць увагу да загатоўкі сьвіных скур.

Партыйныя, камсамольскія арганізацыі раёнаў і нізавы друк павінны ўключыцца ў барацьбу за сьвіную скуру ў сацыялістычнай прамысловасьці.

Б. Р.

Абутковым фабрыкам—сыравінную базу

Скураная прамысловасьць з году ў год пашырае сваю вытворчасьць, павялічвае выпуск прадукцыі. У завяршаючым годзе першай пяцігодкі выпуск абутку па СССР павялічваецца і замест 76,8 млн. у 1931 годзе, у 1932 годзе будзе выпушчаны 91 з пал. млн. пар абутку.

У сувязі з дырэктывамі партыі і ўраду аб разгортваньні жывёлагадоўлі, неарганізаваны забой жывёлы павінен быць спынены. Разам з тым, агульны забой жывёлы таксама зьменшаецца.

Але на практыцы мы наглядаем, што забой жывёлы з боку аднаасобнага сэктара пад уплывам кулацкай агітацыі павялічваецца. Вялікая колькасьць гэтай сыравіны затрымліваецца ў вёсцы і нелегальна перапрацоўваецца, альбо псуецца.

Побач з гэтым патрабаваньне ў скурвырабах расьце.

«Часта чутны скаргі: не хапае рэчаў шырокага спажываньня. Зусім правільна: вельмі не хапае. Усё-ж мы пасунуліся далёка наперад у параўнаньні з даваенным часам. У чым-жа справа? Справа ў тым, што да рэвалюцыі невялікая верхавіна насельніцтва хадзіла абутай, а мільёны хадзілі ў лапцях. Гігантскі вырасла патрэбнасьць — вось у чым справа. Наша задача задаволіць гэтую патрэбнасьць. Што-ж шкодзіць нам? Недахоп сыравіны. І калі сельская гаспадарка настойліва патрабуе ад нас машын і мы даем гэтыя машыны, дык цяпер прышоў час ад сельскай гаспадаркі патрабаваць сыравіны і яна павінна яе даць» (з прамовы тав. Арджанікідзе на 17-й партканфэрэнцыі).

Вынікі загатовак за студзень і дэкаду лютага сьведчаць аб адставаньні некаторых раёнаў у загатоўцы скурсыравіны.

Апроч таго, на вёсцы застаецца як буйная сыравіна, так і дробная, у прыватнасьці апоек (цялячыя скуры). Аб гэтым сьведчыць наступны факт: у Жыткавіцкім раёне пры арганізацыі калектыўнай здачы загатоўлена 500 розных скур. Таксама ў Хойніцкім раёне загатоўлена па калектыўнай здачы каля 100 скур.

Па выкрытых кадушачных (нелегальных) прадпрыемствах у Горацкім і інш. раёнах знойдзена ў перапрацоўцы паміж іншымі сыравінамі і апоек. Колькасьць кадушачнай перапрацоўкі за апошні час прымае значныя размеры. Па Горацкім раёне выкрыта за 2 дні 3 кадушачных прадпрыемствы. Такое-ж становішча ў Лепельскім, Полацкім і Менскім раёнах.

Разам з тым з гэтым злом вядзецца недастатковая барацьба. У Менску слухалася справа аб перапрацоўцы скурсыравіны ў прыгарадным калгасе імя Сталіна. Там было перапрацована 11 буйных скур і ў тым ліку скуры сьвінныя. Між іншым суд апраўдаў праўленьне калгасу. А толькі непасрэднага працаўніка, які перапрацоўваў скуру, аштрафаваў у 20 руб.

Асаблівае значэньне ў забесьпячэньні скурсыравінай прамысловасьці павінна адыграць сьвіная скура.

У загатоўцы сьвіных скур маецца значны зрух у параўнаньні з мінулым годам. Лічба загатоўкі па БССР у параўнаньні з мінулым годам павялічылася амаль у 5 разоў.

Некаторыя сельсаветы Полаччыны, Віцебшчыны і Аршаншчыны паказалі ўзорныя прыклады ў загатоўцы сьвіных скур, але побач з гэтым у радзе раёнаў маецца значнае адставаньне.

Асаблівы прарыў вызначаецца ў наступных раёнах: у Лельчыцкім, дзе процант выкананьня па сьвіных скурах за чацьвёрты квартал складае 12,6 проц., у Петрыкаўскім раёне—11,9, у Старадароскім—20,7 у Хойніцкім—21,7, у Прапойскім—25,4 проц., у Кармянскім—28,1 проц. і г. д.

У гэтых раёнах назіраецца асаблівае адставаньне па загатоўцы сьвіных скур.

Для выкананьня і перавыкананьня пляну па сьвіных скурах ёсьць усе магчымасьці. Разам з тым становішча з забесьпячэньнем прадпрыемстваў скурсыравінай вельмі напружанае.

Клясавы вораг, які спрабуе тармазіць пасьпяховае будаўніцтва сацыялізму, і на гэтым вучастку імкнецца правесьці сваю шкодніцкую работу, агітуючы супроць зьняцьця сьвіных скур.

Пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый трэба мабілізаваць усе сілы на выкананьне і перавыкананьне плянаў загатовак скурсыравіны ў завяршаючым годзе пяцігодкі. Трэба даць рашучы адпор кулацтву і апартуністам, якія зрываюць выкананьне плянаў скуранай прамысловасьці.

Ліпень.

Загатоўчую работу—на вышэйшую ступень

Мінулыя 3 гады былі гадамі ўсясьветна-гістарычных зрухаў ва ўсёй народнай гаспадарцы СССР. Пралетарыят нашай краіны, пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі, пасьпяхова разьвязвае самую трудную і складаную задачу перадзелкі дробна таварнай сялянскай гаспадаркі на сацыялістычны лад.

У 1932-33 г. будзе ў асноўным завершана ў нашай краіне суцэльная калектывізацыя і ліквідацыя кулацтва як клясы. Саўгасы і калгасы ўжо зараз зьяўляюцца асноўнымі трымальнікамі таварнай прадукцыі сельскай гаспадаркі. У загатоўках 1931 г. калгасы займаюць: па бавоўне—70 проц., лёне—51 проц., цукровых буракох—60 проц., тытуну—68 проц., махорке—51 прц.

Рост таварнасьці буйнай вытворчасьці забясьпечыў рэзкае павялічэньне загатовак. Масла і малака было загатоўлена на 1-га сьнежня 1931 г. на 96 проц. больш, чым на тое-ж чысло 1930 г., яек больш на 41 проц., масласемя—на 50 проц. За апошнія тры гады на аснове будаўніцтва саўгасаў і калгасаў колькасьць загатоўленага збожжа павялічылася больш, чым у два разы.

Узмацненьне элемэнтаў плянавасьці ў сельскай гаспадарцы (канцэнтрацыя ў руках дзяржавы таварных запасаў, асабліва збожжа) забясьпечылі магчымасьць пераходу да большай спэцыялізацыі паасобных раёнаў, больш правільнага разьмяшчэньня паасобных сельска-гаспадарчых культур. Рад раёнаў Украіны і Паўночнага Каўказу ператвараецца ў баваўняныя раёны, у раёны тэхнічных культур. Раёны былой спажываючай паласы становяцца раёнамі лёну, гародніны, малака і мяса.

1932 г. і гады 2-й пяцігодкі зьяўляцца перыядам далейшых нябачаных тэмпаў росту прадукцыі сельгасвытворчасьці. Валавая прадукцыя зерня будзе даведзена да канца 2-й пяцігодкі ня менш чым да 1.300 млн. цэнт., прадукцыя па бавоўне і лёне больш чым падвоіцца. У асноўным будзе вырашана жывёлагадоўчая праблема. Толькі ў 1932 годзе, на аснове росту ураджайнасьці, зьмяншэньня страт, мы павінны дамагчыся павялічэньня збору зерня на 120 млн. цэнт.

Гаспадарча-палітычныя абставіны, якія зьмяніліся на вёсцы, патрабуюць іншага падыходу да сельска-гаспадарчых загатовак. Сыстэма кантрактацыі ў яшчэ большай меры, чым дагэтуль, ператвараецца ў зброю арганізаванага ўзьдзейнічаньня на паасобныя калектыўныя гаспадаркі, прадастаўляе найлепшыя магчымасьці арганізацыі заказу да спэцыялізаванага калгасу.

Груба апартуністычнымі зьяўляюцца спробы паасобных працаўнікоў зямельнага і загатоўчага апарату адмаўляць значэньне кантрактацыі на сучасным этапе разьвіцьця ўзаемаадносін паміж горадам і вёскай, паміж прамысловасьцю і сельскай гаспадаркай. Кантрактацыйны дагавор застаецца двухбаковым абавязацельствам, пры чым гэта абавязацельства ўсё больш канкрэтызуецца, дэталізуецца, прыстасоўваецца да асаблівасьцяй засеву паасобных культур.

Кантрактацыя, якая палегчыла «справу аб'яднаньня індывідуальных сялянскіх гаспадарак», унесшая «элемэнты сталасьці ва ўзаемаадносінах паміж дзяржавай і сялянствам» (Сталін), на сучасным этапе дапамагае ажыцьцёвіць двухбаковы заказ ня толькі колькасьці вытвараемай і прадаваемай прадукцыі, але і якасьці асартымэнту прадуктаў.

Барацьба за высокую ураджайнасьць, за высокую якасьць калгаснай прадукцыі, пэўныя стандарты, прыстасаваньне вытворчасьці да спэцыфічных патрэб паасобных катэгорый спажыўцоў, прадпрыемстваў—усе гэтыя пытаньні змогуць быць правільна вырашаны толькі пры ўмове ўзмацненьня арганізуючай ролі прамысловасьці, цясьнейшай сувязі паасобных яе галін і прадпрыемстваў з вытворцамі сельска-гаспадарчай сыравіны, далейшай спэцыялізацыі загатоўчага апарату, яго ўзмацненьня, уключэньня барацьбы за сыравіну ў работу самой прамысловасьці.

Пад кіраўніцтвам партыі праз сыстэму загатоўчых органаў НКСнабам была праароблена вялікая работа па ўкараненьні кантрактацыі, па выдаленьні прыватніка з загатоўчага рынку. Загатоўчы апарат адыграў не малую ролю ў рэалізацыі партыйных дырэктыў па разгортваньні наступленьня па ўсім фронце, ліквідацыі кулацтва як клясы на аснове суцэльнай калектывізацыі, у барацьбе з кулацкімі спробамі сарваць нашы загатоўчыя кампаніі.

Аднак далейшая работа па арганізацыі заказу буйнай сацыялістычнай вытворчасьці на вёсцы, ажыцьцяўленьне штодзённага ўплыву на паасобныя раёны і вытворчыя групы ня можа быць зараз ажыцьцёўлена сіламі аднаго НКСнабу. Спачатку патрэбна ня толькі вялікая спэцыялізацыя кіраўніцтва, але і падвышэньне якасьці плянаваньня і рэгуляваньня ўсёй загатоўчай работы, вялікая цэнтралізацыя агульна-плянавага кіраўніцтва, пры дэцэнтралізацыі непасрэднага апэрацыйнага кіраўніцтва загатоўкамі паасобных культур.

Рашэньне СНК СССР «аб рэарганізацыі загатоўчага апарату», апублікаванае ў «Праўдзе» ад 14 лютага г. г. накіравана да таго, каб зьмяніць сыстэму загатоўчага апарату ў адпаведнасьці са зьменамі адбыўшыміся ў самай сельска-гаспадарчай вытворчасьці, з праведзенай спэцыялізацыяй кіраўніцтва ў прамысловасьці. Агульнае кіраўніцтва ўсёй загатоўчай дзейнасьцю пераходзіць да зноў арганізуемага камітэту па сельска-гаспадарчых загатоўках пры СПА.

Загатоўкі хлеба-фуражных культур, бавоўны, лёну, пянькі і г. д. камітэт праводзіць праз спэцыяльна ствараемыя загатоўчыя арганізацыі («Загатзярнё», «Загатлён», «Загатбавоўна»), непасрэдна яму падначаленыя. Новыя загатоўчыя арганізацыі ствараюцца на аснове аб'яднаньня раней існаваўшых загатоўчых апаратаў (Саюзхлеба, Хлебажывцэнтру, Цэнтрасаюзу, загатоўчых апаратаў, баваўняных трэстаў) па гэтых культурах. Загатоўкі жывёлы сканцэнтроўваюцца ў НКСнабе, прычым для правядзеньня гэтай работы ствараецца адзіная агульна саюзная загатоўчая арганізацыя—«Загатжывёла». Загатоўкі воўны, скуры, новалубяных культур і ўтыльсыравіны (за выключэньнем харчовай утыльсыравіны, загатаўляемай НКСнабам) перадаюцца наркамату лёгкай прамысловасьці, прычым загатоўкі канцэнтруюцца ў спэцыяльных загатоўчых органах.

Загатоўкі сыравіны харчова-смакавай прамысловасьці канцэнтруюцца ў Наркамснабе, які праводзіць загатоўкі па тытуну і махорцы—праз спэцыяльныя загатоўчыя аб'яднаньні (тытунсыравіна); па буракох, тэхнічнай бульбе, садова-гародніне і малаку—праз перапрацоўваючыя прадпрыемствы сваіх прамысловых аб'яднаньняў.

Арганізатарамі сыравіннай базы цукровай прамысловасьці, маслаперапрацоўваючай, малочнай, кансэрвавай, сьпіртавой, крухмала-патачнай павінны выступіць самі заводы, арганізуючы штодзённую сувязь з акаляючымі саўгасамі і калгасамі, дапамагаючы ім палепшаць гаспадарку, падвышаць ураджайнасьць і таварнасьць. Кіраўнікі заводаў і фабрык гэтых галін прамысловасьці павінны ўсвоіць, што яны нясуць адказнасьць перад партыяй за своечасовае правядзеньне засеву, за выкананьне заданьняў па ураджайнасьці, своечасовы збор і вывазку ураджаю.

«Сваёй загатоўчай рабоце ўсе народныя камісарыяты падпарадкоўваюцца Камітэту па загатоўках пры СПА, які ажыцьцяўляе кіраўніцтва загатоўкамі па збожжы, лёне і бавоўне праз свае спэцыяльныя загатоўчыя органы («Загатзбожжа», «Загатлён» і «Загатбавоўна») і іх мясцовыя аддзяленьні, а па іншых відах загатовак—праз адпаведныя наркаматы» (пастанова Саўнаркому).

Пастанова Саўнаркому значна пашырае правы каапэрацыйных арганізацый у загатоўках садова-гародніны, малака, масла, птушкапрадуктаў і прадуктаў дробнай жывёлагадоўлі. Гэтыя загатоўкі павінны быць разгорнуты на аснове непасрэдных дагавароў з калгасамі, далейшага ўзмацненьня сувязі арганізаваных спажыўцоў з вытворцамі.

Спажывецкая каапэрацыя, Нархарч, Усекаапхарч, Дзяржгандаль—шырока разгарнуўшы дэцэнтралізаваныя загатоўкі, акажуць пэўны ўплыў на арганізацыю адпаведных галін калгаснай вытворчасьці. Спажывецкай каапэрацыі як і прамысловасьці трэба перайсьці к сыстэме працяглых дагавароў з калгасамі і саўгасамі, аказваючы ім неабходную арганізацыйную дапамогу. Рашэньне СНК, якое ўносіць буйнейшыя зьмены ва ўсёй сыстэме загатоўчых органаў, узьнімае загатоўчую работу на больш высокую ступень, прыводзіць загатоўчы апарат у адпаведнасьць са зьменамі сацыяльнай і вытворчай структуры сельскай гаспадаркі, набліжае прадпрыемствы да сыравіннай базы, узмацняе сувязь паміж прамысловасьцю і сельскай гаспадаркай, спэцыялізуе і канкрэтызуе кіраўніцтва.

Рашэньне СНК «Аб рэарганізацыі загатоўчага апарату» — практычнае правядзеньне ў жыцьцё дырэктыў партыі аб узмацненьні канкрэтнага кіраўніцтва, аб рабоце па-новаму ў новых умовах. Правядзеньне ў жыцьцё пастановы СНК забясьпечыць выкананьне ў найкарацейшы тэрмін загатоўчых плянаў 1931-32 году. («Праўда»).

Мільёны працоўных— у рады Асоавіяхіму, за практычную вайсковую вучобу

Праблема росту радоў Асоавіяхіму зьяўляецца адной з асноўных, рашаючых у рабоце таварыства. Прыцягненьне шырокай працоўнай грамадзкасьці да актыўнага ўдзелу ва ўзмацненьні абароназдольнасьці краіны магчыма толькі на аснове ўцягненьня не ў актыўнае членства Асоавіяхіму. Вось чаму пытаньні колькаснага павялічэньня радоў Асоавіяхіму, пытаньні якаснага палепшаньня яго складу—ачыстка ад усяго клясава-варожага і стварэньне магутнага ак-



Начсклад—прэміяваныя ударнікі — 1-й каманды СПА Віцебскага АСО, якая прэміявана ЦС Асоавіяхіму СССР.
ЗЬЛЕВА НАПРАВА: Т. Эйтэльмаўм, Шостак Ю., Будняцкі, Шацеркін (кач. к-ды), Шостак Ф., Бабер І., Чэрнамордзік.

тыву,—павінны прыцягваць асаблівую ўвагу ўсіх арганізацый таварыства.

Асоавіяхім БССР штогод павялічвае свае рады, уцягвае ўсё большую колькасьць рабочых, калгасьнікаў і служачых. За тры гады склад таварыства павялічыўся амаль у 10 разоў. Рост яго яскрава сьведчыць аб падвышаным зацікаўленасьці працоўнага насельніцтва да пытаньняў абароны і пра ўзмацненьне аўтарытэту арганізацый Асоавіяхіму.

Але, гаворачы аб бязумоўных посьпехах таварыства, трэба з усёй вастратой ваставіць пытаньне аб тым, што магчымасьці, якія ёсьць, у цэлым радзе выпадкаў арганізацыямі Асоавіяхіму поўнасьцю не выкарыстоўваюцца. Стыхійнасьць, самацёк, недастатковая ўважлівасьць да пытаньняў сацыяльнага адбору, кампанейшчына,—усё гэта яшчэ сустракаецца ў рабоце некаторых раённых і нізавых арганізацый.

Задача рашучага падвышэньня якасьці ўсіх бакоў дзейнасьці Асоавіяхіму, вырашэньня якой патрабуе сацыялістычнае будаўніцтва і яго абарона, непарыўна зьвязана з паглыбленьнем работы ў адносінах росту таварыства, перабудовы гэтай работы на падставе плянавасьці.

Плян росту таварыстваў, намечаны на 1931 год, трэба лічыць выкананым, але папярэднія статыстычныя вынікі паказваюць неаднастайны маштаб работы раённых арганізацый.

У першых радах па частцы выкананьня пляну росту ідуць Гомельская, Асіпавіцкая, Бабруйская, Вузьдзенская, Лагойская, Рагачэўская, Рэчыцкая і Петрыкаўская арганізацыі.

Адстаюць арганізацыі: Крычаўская, якая выканала плян на 29 проц., Старобінская—25,6 проц., Жлобінская—35 проц., Сеньненская—31,6 пр., Шклоўская—45 проц., Бешанковіцкая—13,2 проц., Камарынская—20,3 проц., Касьцюковіцкая—12 проц., Крупская—15 проц.

Стара-Дароская, Гарацкая, Вушацкая, Жыткавіцкая і Сураская арганізацыі ў колькасным складзе, паводле апошніх зьвестак нават, паменшыліся.

Плян росту членаў Асоавіяхіму дакладна азначае сацыяльны твар таварыства. Самае важнае значэньне мае павялічэньне пралетарскага ядра, узмернае падвышэньне яго ўдзельнай вагі ў арганізацыі. Стопроцантнае ўцягненьне рабочых у члены таварыства да канца пяцігодкі зьяўляецца зусім рэальнай і неадкладнай задачай. Згодна пляну, да канца 1931 году ў таварыстве павінны быць 75 проц. усіх рабочых, занятых на вытворчасьці. Стварэньне з групы рабочых перадавога актыву ўдарнікаў абароны, максымальнае ўцягненьне іх у кіруючую работу таварыства,—павінна быць штодзённай задачай раённых арганізацый.

Вялікай напружанай работы патрабуе сацыялістычны сэктар вёскі. Калгасьнікам у таварыстве, паводле пляну, па колькасьці павінна належаць першае месца. Гэта цэлая армія будучых асоавіяхімаўцаў, якая патрабуе сур'ёзнай увагі. Установка саюзнага савету Асоавіяхіму «кожны калгасьнік—член Асоавіяхіму» павінна быць ажыцьцёўлена поўнасьцю.

Раённыя арганізацыі павінны ўзяць асноўны ўпор на шырокае разгортваньне асоавіяхімаўскай работы ў калгасах, саўгасах і МТС, павінны наладзіць штодзённае, канкрэтнае, жывое кіраўніцтва гэтымі ячэйкамі, увязваючы ўсю асоавіяхімаўскую работу на вёсцы з работай па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, бо гэтая работа зьяўляецца важнейшай у калгасах таксама і для ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны.

Яшчэ адзін недахоп у рабоце таварыства—гэта малы процант удзелу жанчын—толькі 21,9. Мы павінны дабіцца поўнага выкананьня ўстаноўкі саюзнага савету Асоавіяхіму аб давядзеньні проценту ўдзелу жанчын да 35.

Вакол вярбоўкі новых членаў Асоавіяхіму павінна праводзіцца шырокая агітацыйна-масавая работа. Неабходна каб кожны працоўны стаў актыўным удзельнікам работы па ўзмацненьні абароназдольнасьці СССР.

Уся работа па павялічэньні радоў Асоавіяхіму павінна стаць на рэйкі сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Кожны актыўны член Асоавіяхіму, таксама як і ячэйка Асоавіяхіму, павінны ўцягваць новыя працоўныя масы і адначасова сачыць, каб у таварыства не пралезьлі клясава-варожыя элементы.

Павялічэньне ўвагі да пытаньняў росту і разгортваньне сацспаборніцтва забясьпечаць ячэйкам Асоавіяхіму, пад кіраўніцтвам мясцовых партарганізацый, пашырэньне і ўзмацненьне ўсёй работы таварыства.

Папова.

Па БССР

Дэкаднік генэральнай праверкі барацьбы за ператварэньне БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці

Пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б

1. Згадзіцца з прапановай НКАсьветы і Культпропу ЦК КП(б)Б аб правядзеньні з 15 па 25 лютага дэкадніка генэральнай праверкі ходу работы па выкананьню дырэктывы ЦК КП(б)Б аб ператварэньні БССР да 1 мая 1932 г. у краіну суцэльнай пісьменнасьці.

2. Прапанаваць ГК і РК КП(б)Б, фракцыям цэнтральных устаноў і арганізацый на працягу дэкадніку забясьпечыць 100 процантны ахоп навучаньнем усіх няпісьменных, замацаваць іх за школай і ўзьняць якасьць навучаньня.

3. Для апэрацыйнага кіраўніцтва правядзеньнем дэкадніка ўтварыць пры ЦВК штаб у складзе: Чарвякова (старшыня) Платуна, Чарнушэвіча, Клімковіча, Рубінчыка (ЦК ЛКСМБ), Бялуга (НКА), Мітліна («Зьвязда»), Шастакоў («Сав. Беларусь»), Пэрліна («Чырвоная Зьмена»), Міхайлаў («Бел. Калгасьнік»), Стрэле, Шукевіч, Сьвярдлова.

ГК і РК КП(б)Б стварыць аналёгічныя штабы пры РВК.

4. На час правядзеньня дэкадніка камандыраваць групу таварышоў з культустаноў у раёны.

Даручыць ГК і РК КП(б)Б праверыць становішча ліквідацыі няпісьменнасьці і прыняць канкрэтныя мерапрыемствы па забясьпячэньні выкананьня дырэктыў ЦК.

5. Прапанаваць усім рэдакцыям цэнтральных і раённых мясцовых газэт прыняць непасрэдны ўдзел у правядзеньні дэкадніка і забясьпечыць штодзённае асьвятленьне ходу работы ў друку.

6. Прасіць ПУР БВА уключыцца ў правядзеньне дэкадніка і забясьпечыць удзел вайсковых часьцей на мясцох у правадзімай рабоце.

Сакратарыят ЦК КП(б)Б.

15 сакавіка—Усебеларускі зьезд прафсаюзаў

ПАСТАНОВА САКРАТАРЫЯТУ ЦСПСБ АБ ТЭРМІНЕ СКЛІКАНЬНЯ VII УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ ПРАФСАЮЗАЎ.

1. На падставе рашэньняў Сакратарыяту ЎсеЦСПС аб адтэрмінаваньні правядзеньня прафсаюзных зьездаў—VII усебеларускі зьезд прафсаюзаў скліканы на 15 сакавіка.

2. Прапанаваць усім ЦП, якія не правялі ўсебеларускія канфэрэнцыі саюзаў і Райгарпрафсаветам, якія не склікалі міжсаюзныя раённыя прафсаюзныя зьезды—правесьці апошнія паміж 1—10 сакавіка.

Даручыць Аргінструктарскаму сэктару разам з ЦП саюзаў і Райгарпрафсаветамі ўстанавіць тэрміны скліканьня канфэрэнцый і зьездаў з тым, каб не пазьней 10 сакавіка скончыць правядзеньне іх.

3. Даручыць Аргінструктарскаму сэктару зараз распачаць справаздачу ЦСПСБ на раней вызначаных прадпрыемствах, скарыстаўшы для правядзеньня гэтага мерапрыемства членаў Прэзыдыуму ЦСПСБ і ЦП саюзаў у час выезду іх па заключэньні калдагавароў, абавязаўшы загадзя дагаварыцца вылучаным таварышом з Райгарпрафсаветамі аб правадзімай рабоце.

4. Усім ЦП саюзаў і Райгарпрафсаветам узмоцніць масавую работу па падрыхтоўцы да VII усебеларускага зьезду прафсаюзаў.

Прэміі лепшым

Усебеларускі зьлёт ударнікаў сьвінагадоўчых саўгасаў пастанавіў прэміяваць рад работнікаў за добрую работу на фронце сьвінагадоўлі. Прэм'яваны наступныя работнікі:

Тав. **Берастовіч**—сьвінарка саўгасу імя Сталіна, унесла 2 рацыяналізатарскія прапановы, абедзьве прыняты. Працуе ў гаспадарча-разьліковай брыгадзе. Прэміравана—150 руб.

Тав. **Саўчанка** — сьвінарка гэтагажа саўгасу, прэм'явана ў 150 руб.

Тав. **Жданава**—сьвінарка саўгасу «Вусьце», унесла 8 рацыяналізатарскіх прапаноў, з якіх прынята 5, працуе ў гаспадарча-разьліковай брыгадзе, прэм'явана 150 руб.

Тав. **Анцыпэровіч**—сьвінарка саўгасу «Беларусь», унесла 15 рацыяналізатарскіх прапаноў, прыняты ўсе, прэм'явана 150 руб.

Тав. **Федарынчык**—сьвінар саўгасу Блонь, 6 разоў прэм'яваўся, атрымаў 150 руб.

Тав. **Ціхаміраў**—заатэхнік саўгасу Лучыцы, унёс дзьве рацыяналізатарскія прапановы. Абедзьве прыняты. Прэміраваны 200 руб.

Тав. **Несьцяраў**—заатэхнік саўгасу «Камсамольская Праўда» прэм'яваны 200 руб.

Тав. **Лалька**—вэтдоктар саўгасу Сялец-Гаўрылаўка, два разы прэм'яваўся. Атрымаў 250 руб.

Тав. **Лысенка**—вылучэнец, намесьнік дырэктара саўгасу Жалязьнякі, атрымаў 300 руб.

Тав. **Ляўковіч**—старшыня рабочкому саўгасу Лучыцы, прымае актыўны ўдзел у арганізацыі грамадзкага харчаваньня добра арганізаваў прафработу. Атрымаў 200 руб.

Тав. **Сухавераў**—старшыня рабочкому саўгасу Лемніца, ударна правёў набор рабочай сілы, за належны ўдзел у грамадзкім харчаваньні атрымаў прэмію ў 200 руб.

Тав. **Бардзілоўскі**—старшыня рабочкому саўгасу Халопенічы—за добрую работу прэміруецца ў 200 руб.

Апроч таго, наступныя ўдарнікі прэміруюцца месцамі адпачынку Паўднёвага берагу Крыму: тав. Шырына П.—ударніца саўгасу Бранчыцы, тав. Богаш саўгасу Хальч, тав. Заяц саўгасу Бачэйкава, тав. Фінькевіч—саўгасу Кухцічы, тав. Калнін, старшыня вытворчай нарады саўгасу Райцы, тав. Забыстаў—заатэхнік саўгасу Івань. Тав. Сідараў—тэхнік-сьвіновод саўгасу Луцэўшчына. Тав. Кротаў—намесьнік дырэктара саўгасу Саматэвічы. Тав. Федасенка—старшыня рабачкому саўгасу Сялец-Гаўрылаўка. Тав. Крук—старшыня рабачкому саўгасу Веснава.

Апроч таго, наступныя работнікі прэміруюцца рэспубліканскім камітэтам саюзу жывёлагадоўчых саўгасаў ганаровымі граматамі: тав. Жук—старшыня вытворчай нарады саўгасу Халопенічы, тав. Высоцкі—сьвінар саўгасу Замошша.

Першымі па БССР прадставілі раённыя зводкі па вучоту жывёлы Бешанковіцкі і Расонскі раёны. Зводкі атрыманы ў Дзяржпляне раніцой 14 лютага, пры абавязковым для ўсіх раёнаў тэрміне—16 лютага.

Полацкім райштабам па правядзеньні Ўсебеларускага рэйду ўдарных брыгад друку і КК-РСІ 8-га лютага накіравана ў розныя сельсаветы з ліку актыву РСІ і ўдарнікаў друку—23 працаўніка для арганізацыі і правядзеньня на мясцох работы па рэйду праверкі падрыхтаванасьці да трэцяй бальшавіцкай сяўбы.

Па лініі рэдкалегій насьценгазэт арганізуецца 4 выязных рэдкалегіі ў калгасы. Дзьве рэдкалегіі ўжо выехалі. Рэдкалегіі насьценгазэты Сельбудтэхнікуму і Педтэхнікуму павінны выехаць 11 лютага.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

па дакладах Асьвейскага і Капыльскага раённых выканаўчых камітэтаў аб ходзе загатовак лёну, пянькі і збожжа

Выслухаўшы даклады старшыні Асьвейскага РВК т. Клопава і старшыні Капыльскага РВК т. Вайцахоўскага аб ходзе загатовак лёну, пянькі і збожжа ў гэтых раёнах, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Адзначыць, што загатоўка лёну ў Асьвейскім і Капыльскім раёнах праходзіць зусім нездавальняюча, раённыя арганізацыі на гэтае пытаньне не зварочваюць дастатковай увагі, а раённыя выканаўчыя камітэты не мабілізавалі грамадзкасьці на пасьпяховае выкананьне пляну гэтых загатовак.

Прапанаваць старшыням паказаных вышэй раёнаў, пад іх асабістую адказнасьць, ужыць захады, каб у самы кароткі тэрмін дабіцца пералому ў лёнзагатоўках і забясьпечыць поўнае выкананьне пляну.

2. Адзначыць зусім дрэннае выкананьне пляну загатовак збожжа ў Капыльскім раёне і прапанаваць Капыльскаму РВК ужыць тэрміновыя захады да выкананьня на працягу дэкады гэтага пляну і не пазьней 20 лютага г.г. паведаміць тэлеграфна СНК аб выкананьні гэтай пастановы.

3. Адзначыць, што Асьвейскі РВК не толькі выканаў, але і перавыканаў плян збожжазагатовак.

4. Прыняць да ведама паведамленьне старшыні Капыльскага РВК т. Вайцахоўскага аб тым, што кантрактацыя малака ў раёне праведзена на 85 проц., і паведамленьне старшыні Асьвейскага РВК т. Клопава, што ў Асьвейскім раёне кантрактацыя малака праведзена на 59 проц. (апрача саўгасаў).

5. Даручыць НК Снабжэньня ўрэгуляваць пытаньне з завозам прамысловых тавараў у Капыльскі раён для стымуляваньня збожжазагатовак.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР. **С. Кандыбовіч.**

4-га лютага, 1932 г.
г. Менск, № 66.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра палепшаньне работы жыльлёвай кааперацыі

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць Белжылсаюзу разбуйніць ЖАКТ'ы, выходзячы з жыльлёвай плошчы на адзін ЖАКТ ад 1000 да 3000 кв. мэтраў.

2. Даручыць Белжылсаюзу да 1 красавіка 1932 г. перазаключыць дагаворы з органамі камунальнае гаспадаркі на арэнду ЖАКТамі дамаўладаньняў на падставе тыпавага дагавору, распрацаванага Народным Камісарыятам Камунальнай Гаспадаркі і Белжылсаюзам.

3. Арганізаваць самастойныя жыльлёва-будаўнічыя кааперацыйныя таварыствы пры буйных прадпрыемствах, а для абслугоўваньня рабочых дробных прадпрыемстваў і іншых працоўных арганізаваць жыльлёва-будаўнічыя кааперацыйныя таварыствы па тэрытарыяльным і раённым прынцыпе ў адпаведнасьці з мясцовымі ўмовамі.

4. Прызнаючы жыльлёвую кааперацыю лепшаю формаю кіраваньня жыльлёвым фондам, прапанаваць гарадзкім саветам, гаспадарчым арганізацыям і прадпрыемствам увесь мунцыпалізаваны і новы жыльлёвы фонд перадаваць у эксплёатацыю жыльлёва-арэнднай кааперацыі, апроч таго камунальнага фонду ў гарадох Менску і Віцебску, які беспасрэдна кіруецца дамавымі трэстамі.

5. Прапанаваць Белжылсаюзу перавесьці ўсе жыльлёва-арэндныя і жыльлёва-будаўнічыя кааперацыйныя таварыствы на гаспадарчы разрахунак.

У распараджэньні ЖАКТ'аў знаходзіцца:

а) уся сума кватэрнай платы;

б) 50 проц. паю членаў ЖАКТ'аў, прычым другія 50 проц. перадаюцца вышэйшым кааперацыйным арганізацыям на вытворчыя патрэбы.

6. Лічыць мэтазгодным прымацаваць частку ЖАКТ'аў да паасобных прадпрыемстваў і ўстаноў, прычым у ЖАКТ'ах, прымацаваных да прадпрыемстваў, 90 проц. вольнай плошчы засяляецца рабочымі і прыроўненымі да іх групамі працоўных гэтых прадпрыемстваў.

7. Лічыць мэтазгодным, каб пры гарадзкіх жылсаюзах былі ўтвораны фонды для прэм'яваньня будаўнічымі матар'яламі паасобных ЖАКТ'аў, якія пасьпяхова выконваюць плян мабілізацыі сродкаў, а таксама для прэм'яваньня паасобных работнікаў ЖАКТ'аў грашмі.

8. Для правядзеньня рамонту і забясьпечаньня рамонтных работ будаўнічымі матар'яламі, арганізаваць пры гарадзкіх жылсаюзах рамонтныя канторы на гаспадарчым разрахунку, а таксама адчыніць патрэбную колькасьць зачыненых магазынаў будаўнічых матар'ялаў.

9. Прапанаваць Белжылсаюзу разгарнуць будаўніцтва культбытавых устаноў (дзіцячыя яслі, сады, пляцоўкі, пральні і інш.).

10. Вылучыць з складу Белбудканторы наступныя самастойныя аб'яднаньні на гаспадарчым разрахунку, падпарадкаваныя Белжылсаюзу:

а) Аб'яднаньне для вырабу стандартных дамоў і новых будаўнічых матар'ялаў;

б) Кантора па забясьпечаньні будаўнічымі матар'яламі жыльлёва-кааперацыйных таварыстваў.

11. З тае прычыны, што рад прадпрыемстваў мае шмат матар'ялаў і абсталяваньня, якія няпрыгодны для эксплёатацыі на прадпрыемствах, але могуць быць цалкам скарыстаны на рамонт дамоў, шырока арганізаваць мабілізацыю і перадачу паказаных матар'ялаў і абсталяваньня ў рамонтны фонд дамоў. Арганізаваць таксама адбор з фонду мэталялому годных для рамонту мэталядэталяў (краны, муфты, дахавае жалеза і г. д.).

12. Для перавозкі будаўнічых матарыялаў і апалу, а таксама для вывазкі сьнегу, сьмецьця, нячыстот і інш. з дамаўладаньняў жыльлёва-кааперацыйных таварыстваў, арганізаваць на працягу месяца на гаспадарчым разрахунку пры гарадзкіх жылсаюзах транспарт.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР **С. Кандыбовіч.**

16 студзеня 1931 г.
г. Менск.
№ 36.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра абзяляненьне гарадоў

Надаючы вялікае значэньне справе разьвіцьця і пашырэньня зялёных насаджэньняў у гарадох і адзначаючы, што ў сучасны момант плошча гэтых насаджэньняў недастаткова, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Згадзіцца з прапановаю Народнага Камісарыяту Камунальнай Гаспадаркі аб арганізацыі ў гарадох: Менску, Віцебску, Гомелі, Бабруйску, Магілеве, Воршы, Полацку, Барысаве, Жлобіне; Калінкавічах, Лепелі, Слуцку і Чэрвені гадавальнікаў дэкаратыўных зялёных насаджэньняў.

Прапанаваць гарадзкім саветам паказаных вышэй гарадоў ужыць захады да вырошчваньня насаджэньняў для абзяляненьня гарадоў і адвесьці пад гадавальнікі дэкаратыўных зялёных насаджэньняў зямельную плошчу ў размеры да 5 га ў кожным горадзе, канчаткова арганізаваўшы іх вясною 1932 г.

2. Прапанаваць усім гарадзкім саветам штогод уключаць у пляны дабрабыту гарадоў работы па абзяляненьню гарадоў і прадугледжваць у сваіх каштарысах сродкі на фінансаваньне гэтых работ.

3. Даручыць НК Камунальнай Гаспадаркі скласьці разам з гарадзкімі саветамі дакладны плян абзяляненьня гарадоў.

4. Абавязаць гарадзкія саветы прывесьці ў належны парадак існуючыя сады, скверы і інш. зялёныя насаджэньні.

5. Прызнаць неабходным удзел шырокіх колаў грамадзкасьці (асабліва ЖАКТ-аў) у справе абзяляненьня гарадоў.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**

Кіраўнік Спраў СНК і Эканамічнага Савету БССР **С. Кандыбовіч.**

4 лютага 1932 г.
г. Менск, № 55.

Пастанова Народнага Камісарыяту РСІ БССР ад 8-II 32 г.

пра барацьбу з лішняй тэлеграфнай перапіскай

1. Адзначаючы, што пастанова Калегіі НК-РСІ БССР ад 20-III—31 г. аб скарачэньні лішняй тэлеграфнай перапіскі многімі ўстановамі дагэтуль ня выконваецца, адзначаю, як недапушчальныя факты парушэньня пастановы Калегіі НК РСІ наступныя:

а) Бел. Кантора Саюзскур паслала 29-X—31 г. тэлеграму ва ўсе раёны БССР па 4-х адрасох, колькасьцю 150 слоў, коштам 322 руб. з заклікам выкананьня пляну скурзагатовак да XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Пры чым тэлеграма мае на сабе 6 подпісаў з паказаньнем прадстаўніком якой установы зьяўляецца кожны падпісаўшыйся (Белскураб'яднаньне — (подпіс) Белкаапсаюз — Хаскін, Белхлебжыўсаюз—Бачыпча, Наркамснаб—Красоўскі, саюз Скурнікаў—Левінсон, штаб скурзагатовак—Гольдбэрг, Саюзскур—Бурштэйн). Вінаватым у пасылцы гэтай тэлеграмы зьяўляецца нам. упаўнаважанага Саюзскур па БССР тав. Бурштэйн.

б) Бел. Кантора Саюздрук 5-XII—31 г. разаслала па ўсіх раёнах БССР, па 7 адрасох тэлеграму адносна падпіскі на газэты на 1932 г., прычым тэлеграма паслана за 8 подпісамі (ад ЦВК—Шкапаравіч, Шынько, ЦК ЛКСМБ—Пэрліна, НКАсьветы—Брычевіч, ВСПГ—Панкоў, ЦСПСБ—Клімковіч, НКЗем—Масюкоў, Саюздрук—Ярмаловіч), у той час, як аб гэтым-жа 5, 22, 25 лістапада былі Саюздрукам разасланы абежнікі па ўсіх раёнах. Пры чым, як высьветлілася, подпісы многіх асоб на гэтай тэлеграме былі атрыманы шляхам увядзеньня іх у заблуджэньне аб сапраўднай мэце. Вінаватым у пасылцы гэтай тэлеграмы зьяўляецца быв. заг. сэктару распаўсюджваньня Бел. Канторы «Саюздруку» т. Ярмаловіч.

2. Расцэньваючы гэтыя факты, як грубае парушэньне прынцыпаў рэжыму эканоміі і ігнараваньня пастановы Калегіі НК РСІ Бел. ад 20-III—31 г. абвясьціць вымову з занясеньнем у працоўны сьпіс нам. упаўнаважанага Саюзскур па БССР т. Бурштэйну, быв. заг. сэктару распаўсюджваньня Саюздруку—т. Ярмаловічу.

3. Папярэдзіць кіраўнікоў усіх устаноў і прадпрыемстваў аб неабходнасьці зьвярнуць большую ўвагу на справу барацьбы з лішняй тэлеграфнай перапіскай і аб іх пэрсанальнай адказнасьці за поўнае ажыцьцяўленьне пастановы Калегіі НК РСІ Бел. ад 20-III—31 г.

4. Гэтую пастанову апублікаваць у друку.

Нам. Наркома РСІ БССР Гурэвіч.

АБВЯШЧЭНЬНЕ

17-II, а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Аб'яднанага бюро скаргаў ЦКК НК-РСІ (Савецкая, 55, 1-шы паверх), адбудзецца пасяджэньне Аб'яднага бюро скаргаў, на якім будуць разгледжаны наступныя справы:

1. Справа Рудкоўскага аб зьняцьці яго з работы.
2. Вынікі праверкі работы дому адпачынку Ждановічы.
3. Справа Бальцэвіча.
4. Справа Булькульштэйна.
5. Справа Розіна.
6. Справа сталоўкі ТПО № 2.
7. Справа Простака.

Усе таварышы якіх датычацца гэтыя справы, павінны зьявіцца. Выклікаюцца рабочыя засядацелі: Каждан, Лютоўнік, Жывіца, Абрамская (хім. фармзавод); Пятрушкін, Валынец, Каган (шчыцінная фабрыка), Масюкевіч, Штоп, Тумаровіч, Голуб, Вэранкоў (служба шляху МББ чыгункі). Запрашаецца актыў і «ЛК»

Загадчык Аб'яднага бюро скаргаў ЦКК НК-РСІ Бел ЗЯБКІН.

ПАПРАЎКА.

У № 37 газ. «Савецкая Беларусь» на 4-ай старонцы памылкова надрукаваны загаловак над артыкулам І. Гурскага: «Пяты год БДТ-2», трэба чытаць: «Пяць год БДТ.2».

Нам. адказнага рэдактара.
Г. АДАМСОН.

АБ'ЯВА АБ РЭГІСТРАЦЫІ

15 студзеня 1932 г. Народным Камісарыятам Фінансаў БССР
на падставе арт. 2-4 Палажэньня аб дзяржаўнай рэгістрацыі ад 9-II 1931 г.
(Збор Законаў і Загадаў СССР № 8, паст. 99)
ЗАРЭГІСТРАВАНА Ў РЭЕСТРЫ ЮРЫДЫЧНЫХ АСОБ за № 41 (сорак адзін)
Беларуская Кантора Акцыйнага Таварыства
„ЭКСПАРТЛЕС"
Праўленьне Акцыйнага Таварыства знаходзіцца ў Маскве ў веданьні Наркамзамежгандлю СССР.
Месцазнаходжаньне Беларускай Канторы—Менск, Пляц Волі, № 7.

ГЭТЫМІ ДНЯМІ ПАЧЫНАЕ ВЫХОДЗІЦЬ

ДЗЕСЯЦІДЗЁННАЯ ГАЗЭТА
органу Фэдэрацыі Аб'яднаньняў Савецкіх Пісьменьнікаў і Галоўмастацтва БССР
„ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА"
ПАДПІСКА НА ГАЗЭТУ ПРЫМАЕЦЦА
ва ўсіх паштовых агенцтвах і ў лістаносцаў
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА НА МЕСЯЦ 15 кап.
(Газэта выходзіць 3 разы ў месяц)
Усе матар'ялы і карэспандэнцыі дасылаць на адрас: Менск, Савецкая, 68, рэдакцыі газэты „Літаратура і мастацтва"

Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь"
—) ПАТРАБУЮЦЦА (—
на дзённую і вячэрнюю работу
МАШЫНІСТКІ,
якія добра ведаюць беларускую мову
Звяртацца ад 12 да 19 гадз., Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх.

ЗГУБЛЕН выканаўчы ліст на атрыманьне аліментаў, выд. нарсудом 3 уч. гр. Лейчанка Н. К., лічыць несапраўдным.

ЗГУБЛЕНА дамавая кніга дому № 29 па Камуністычнай вул., жакту № 19, лічыць несапраўднай.

БЕЛМАЛПРАМТРЭСТ ГЭТЫМ АБВЯШЧАЕ,
што пры Уваравіцкім Аўта-Трактарным Тэхнікуме
АДКРЫТЫ КУРСЫ СТАРЭЙШЫХ ТРАКТАРЫСТАЎ,
на якія прымаюцца асобы скончыўшыя курсы трактарыстаў і, ў першую чаргу рабочыя саўгасаў, калгасаў і маючыя вытворчы стаж работы на трактары ня менш 2-х год.
Пасьля сканчэньня курсаў асобы, скончыўшыя іх, павінны будуць адпрацаваць у сыстэме Белмалпрамтрэсту ня менш 2-х год.
Умовы наступныя: стыпэндыя 25 руб. у месяц, кватэра, пры тэхнікуме ёсьць сталоўка. Да заявы павінны быць прыкладзены наступныя дакуманты:
1. Аб працы. 2. Аб узросьце. 3. Аб стане здароўя. 4. Аб асьвеце. 5. Камандыроўка ад саўгасу, або калгасу і ва 30 кап. паштовых марак для адказу.
ПРЫЕМ ЗАЯЎ ДА 20-га ЛЮТАГА 1932 г.
Заявы накіроўваць па адрасу: ст. Уза, Зах. чыг. п-а Уваравічы, Кантора Трактарных Курсаў.
Загадчык Трактарных Курсаў ЦЯРЭШКА

ГЭТЫМ АБВЯШЧАЕЦЦА,
што з 10 лютага 1932 г. Стрэшынскае, Салтанаўскае і Чырвона-Бярэзскае першапачатковыя вытворчыя таварыствы Жлобінскага раёну
ЛІКВІДУЮЦЦА
Усе прэтэнзіі да паказаных таварыстваў павінны быць накіраваны ў ліквідацыйныя камісіі гэтых т-ваў, якія працуюць да 1 сакавіка г.г.,
пасьля якога тэрміну ніякія прэтэнзіі ўстаноў, арганізацый і прыватных асоб да паказаных таварыстваў
ПРЫМАЦЦА НЯ БУДУЦЬ
Райкаапсаюз

ПАСТАНОВА

Галоўны Арбітр пры СНК БССР на падставе пастановы СНК СССР за 8-XII 1931 году
„Аб мерах узмацненьня работы органаў Дзяржаўнага арбітража" (З. З. СССР 1931 г., № 70 арт. 470)

ПАСТАНАВІЎ:

Загадчыка фінсэктарам Менскага ЦРК тав. Басензона і бухгальтара Менскага п. Бел. К-ры Саюзхлеба тав. Фэльмана, аштрафаваць кожнага на 50 руб. за дапушчаную імі заблытанасьць бухгальтэрыі па вучоту тары, што выявілася пры разглядзе ў Дзяржарбітражы справы па спрэчцы Бел. Канторы Саюзхлеба з МЦРК аб 65/50 руб. 85 к. за незварот тары.

Галоўны Арбітр пры СНК БССР

9 лютага 1932 г.
г. Менск

Даводзіцца да ведама ўсіх паляўнічых,
што паляваньне на ўсе віды **ПУШНІНЫ**
ПРАЦЯГНУТА
да 1 сакавіка 1932 г.
за выключэньнем белкі да 25-II 32 г.
Упаўн. НКЗ Гандлю СССР пры СНК БССР.

Вайсковы білет Ганчарова С. М., выд. Гарацкім ваенкаматам. Квітанц. 1388-п.

АДРАС РЭДАКЦЫІ і ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Пляц Волі, 17. Тэлефоны: Адказны рэдактар—7-69, адказны сакратар 4-78, сэктары 6—15, выпускаючы—12 65 два званкі, выдавецтва—2-44.
Умовы падпіскі: на 1 год—12р., 6 месяцаў—6 руб., 3 м-цы—3 руб., 1 месяц—1 руб. Падпіска прымаецца выключна на пошце

Упаўнаваж. Галоўлітбел. № А—53.

Друкарня імя Сталіна.